WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

7 ЛЮТАГА 2012 г.
АЎТОРАК
№ 24
(27139)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## НА ПРАЦЯГУ ГОДА-ПАЎТАРА МАГЧЫМА ВЯРТАННЕ ЗАРПЛАТ НА ДАКРЫЗІСНЫ ЎЗРОВЕНЬ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 6 лютага прыняў з дакладам Старшыню Праўлення Нацыянальнага банка Надзею Ермакову.**

«Пры нармальным функцыянаванні эканомікі і калі нармальна будуць працаваць працоўныя калектывы, мы на працягу года-паўтара не проста вернемся на былыя пазіцыі па заработнай плаце людзей, але мы можам іх і перавысіць, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — У нас ёсць магчымасць зарабіць нармальныя грошы для таго, каб людзі адчулі паляпшэнне жыцця, і гэта ўжо адбываецца. І я думаю, што калі мы нармальна выйдзем з гэтай няпростай зімы, я маю на ўвазе, каб не давялося перасяваць пасевы з-за маразоў і гэтак далей, то мы знойдзем гэтыя грошы».

«Але мы ні ў якім разе не павінны друкаваць грошы, гэта абсалютна выключана», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён звярнуў увагу на высокую стаўку банкаў па крэдытах, што выдаюцца. «Вельмі дарагія крэдытныя рэсурсы. Эканоміка, зразумела, цярпець такую сітуацыю з крэдытамі доўга не можа, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Таму стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка паціху-паціху павінна зніжацца. Мы павінны даваць і сігналы нармальным эканоміцы нашай краіны, суб'ектам гаспадарання, ды і фактычна стаўка павінна быць ніжэй, таму што пры цяперашняй гаварыць пра нейкае інтэнсіўнае развіццё эканомікі нельга».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што сёлета «ўсе павінны забыць, што на крэдытаванне могуць выкарыстоўвацца эмісійныя грошы».

Прэзідэнту паведамілі таксама пра стан спраў з укладамі. Як адзначыла Старшыня праўлення Нацбанка, ёсць прырост па ўкладах як у беларускіх рублях, так і ў валюце, пры гэтым больш высокімі тэмпамі растуць валютныя ўклады.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.02.2012 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ |
|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША ........ 8 370,00 | 1 чэшская крона ........ 437,19 | USD ........ 30,2324 |
| ▲ 1 еўра ........ 10 940,00 | 1 польскі злоты ........ 2 623,87 | 10 UAH ........ 37,6118 |
| 1 латвійскі лат ........ 15 624,42 | ▼ 1 расійскі рубель ........ 277,00 | 10000 BYR ........ 35,8629 |
| 1 літоўскі літ ........ 3 166,14 | 1 украінская грыўня ........ 1 041,24 | EUR ........ 39,5137 |



## У ВЫХАДНЫЯ ДАР'Я ДОМРАЧАВА ДВОЙЧЫ ПАДЫМАЛАСЯ НА П'ЕДЭСТАЛ

**За выхадныя, падчас якіх у нарвежскім Холменколене на сёмым этапе Кубка свету прайшлі гонкі праследавання і мас-старт, беларуска Дар'я Домрачава двойчы падымалася на п'едэстал і з 75 да 21 ачка скарацiла адставанне ў агульным заліку Кубка свету ад лідара Магдалены Нойнер. Усяго ж у гэтым сезоне Дар'я пабывала на п'едэстале дзесяць разоў.**

У гонцы праследавання, дзе лідар нашай каманды стартавала з адрывам у 38 секунд ад Нойнер, Дар'я фінішавала трэцяй. Яна трымалася за Нойнер і не падпускала праследавацельніц да трэцяй стральбы, падчас якой з-за праблем з вінтоўкай Даша не закрыла дзве мішэні. Два штрафныя кругі адкінулі Домрачаву на 6-е месца. Нойнер жа на стрэльбішчы не памылялася. Падчас чацвёртай стральбы беларусцы ўдалося сабрацца — ніводнага промаху — і яна кінулася даганяць Нойнер. У выніку немка, якая прайшла ўсю дыстанцыю без промахаў, выйграла гонку праследавання, другой стала расіянка Вольга Зайцава, Дар'я Домрачава замкнула тройку прызёраў.

На наступны дзень у мас-старце Нойнер на лыжню не выйшла з-за прастуды — трэнеры вырашылі пабергчы яе напярэдадні чэмпіянату свету. Для Дашы гэта быў выдатны шанц скараціць адставанне ў агульным заліку. І ёй гэта ўдалося — праўда, зноў-такі ў сваім стылі з трылерскім сюжэтам. На кожным агнявым рубяжы Дар'я дапускала па адным промаху і намотвала штрафныя кругі, у той час як больш трапныя суперніцы выходзілі наперад. Але Дар'я кожны раз уключала сваю звышхуткасць, і ў выніку з шостай пазіцыі пасля заключнай стральбы і штрафнога круга яна на фінішы выйшла на другое месца, адыграўшы ў суперніц 20 секунд! Выдатны вынік, які дазволіць Дар'і прэтэндаваць і на малы хрустальны глобус па выніках у мас-старце. Гонка прынесла Домрачавай 54 ачкі, дзякуючы чаму адставанне цяпер ад Нойнер цалкам адыгрываецца — усяго 21 ачко. Святкавала перамогу ў мас-старце сяброўка Нойнер па камандзе, 34-гадовая Андрэа Хенкель. Гэта першая перамога ў сезоне самай узроставай біятланісткі на этапе ў Холменколене.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

**Увага!**

## Шмат снегу і лютыя маразы

*Прагназуецца, што ў выхадныя ўначы будзе да мінус 34 градусаў*

**І на гэтым тыдні ў Беларусі захаваецца вельмі халоднае надвор'е, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

У сераду і чацвер атмасферны ціск пачне павялічвацца, кароткачасовы снег чакаецца толькі месцамі, а маразы зноў узмоцняцца. Уначы прагназуецца мінус 13—20, пры праясненнях ужо 21—25 градусаў ніжэй за нуль; удзень — 10—17 марозу.

Сіноптыкі прагназуюць, што сапраўды па-сур'ёзнаму мы тыднем мерзнуць напрыканцы тыдня, калі чарговую порцыю халоднага паветра прынясе ў Беларусь арктычнае паветра з Сібіры. Мяркуецца, што 10—12 лютага ў асобных раёнах пройдзе невялікі снег, а маразы ўначы ўсталююцца ў межах мінус 22—30 градусаў, месцамі нават да 32—34 градусаў ніжэй за нуль. Будзе холадна і ўдзень, калі чакаецца 13—20 марозу, месцамі — да 25 градусаў ніжэй за нуль. Толькі ў нядзелю ў заходніх раёнах краіны ўначы мінус 17—22 градусы, удзень — 7—12 марозу.

Сіноптыкі адзначаюць, што ў мінулыя выхадныя моцныя снегапады былі зафіксаваны на паўднёвым усходзе Беларусі. Толькі за некалькі дзён вышыня снежнага покрыва на ўсходзе краіны павялічылася на 6—12 сантыметраў, а ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях — на 21—37 см.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ISSN 1990 - 763X

## ГРАДУС ДАБРЫНІ

**Мінулыя субота і нядзеля для многіх мінчан прайшлі ў клопатах пра птушак, якія зімуюць у палонцы вадасховішча Крыніца (паблізу Ждановічаў). З раніцы да змяркання да азёрнага берага бесперапынна падрульвалі легкавушкі. Аўтаўладальнікі неслі крупы, хлеб, нават спецыяльна прыгатаваныя кашы і сумесі. Інфармацыя пра невялікую палонку з лебедзямі і качкамі, якія пакутуюць ад дваццаціградусных маразоў, хутка разляцелася па сталіцы і была ўспрынята літаральна як сігнал «SOS».**

«Хто, калі не мы?»— без ваганняў цэлымі сем'ямі спяшаліся на ўскраіну горада жыхары сталіцы, каб падтрымаць безабаронных вязняў нечаканага разгулу маразоў. Птушкі ж даверліва апаноўвалі бераг з ласункамі, не палохаліся людзей.

СТАР. 4



Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.



# КІРАЎНІК ДЗЯРЖАВЫ ЗАПАТРАБАВАЎ ПРЫНЯЦЬ МЕРЫ ПА АКТЫВІЗАЦЫІ БАРАЦЬБЫ З КАРУПЦЫЯЙ І АРГЗЛАЧЫННАСЦЮ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 6 лютага прыняў з дакладам генеральнага пракурора Беларусі Аляксандра Канюка. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Прэзідэнт адразу абазначыў найбольш актуальныя пытанні для абмеркавання: сітуацыя ў сістэме органаў пракуратуры ў цэлым, у тым ліку з пункту гледжання кадравага складу, стан спраў у праваахоўнай сферы, асабліва ў частцы барацьбы са злачыннасцю. Асобная ўвага была ўдзелена ходу фарміравання Следчага камітэта і яго ўзаемадзеянню з Генпракуратурай. «Следчы камітэт — гэта дзіця МУС, Генпракуратуры, Камітэта дзяржаўнага кантролю, іншых праваахоўных органаў. Вы павінны кантраляваць сітуацыю са стварэннем Следчага камітэта», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што работу органаў пракуратуры па наглядзе за выкананнем законаў трэба праводзіць мэтанакіравана. Для гэтага пракуроры павінны быць вызвалены ад неўласцівых ім функцый.

У ходзе сустрэчы кіраўнік дзяржавы чарговы раз запатрабаваў прыняць вычарпальныя меры па актывізацыі барацьбы з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю.

Як далажыў генеральны пракурор, новы алгарытм узаемадносін з іншымі праваахоўнымі органамі ў гэтай сферы цяпер выпрацоўваецца, каб гэта работа была пастаўлена на больш высокім узроўні. У 2011 годзе адбылося зніжэнне агульнай колькасці злачынстваў, у тым ліку цяжкіх і асабліва цяжкіх.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўсе асноўныя пытанні дзейнасці органаў пракуратуры будуць разгледжаны на спецыяльнай нарадзе ў Прэзідэнта.

## Украіна адновіць пастаўкі электраэнергіі ў Беларусь не раней за 8 лютага

**Пра гэта паведамілі БЕЛТА ў ДВА «Белэнерга».**

«Да 8 лютага паставак украінскай электраэнергіі не чакаецца. Аб тым, ці будуць яны адноўлены пасля гэтай даты, украінскі бок праінфармуе пазней дадаткова», — растлумачылі ў аб'яднанні.

Украіна з-за моцных маразоў у краіне прыпыніла экспарт электраэнергіі ў Беларусь. У энергасістэмы Беларусі дастаткова магутнасцяў для пакрыцця патрэб спажыўцоў электраэнергіі. Такім чынам, часовае прыпыненне паставак у Беларусь украінскай электраэнергіі ніяк не паўплывае на надзейнасць энергазабеспячэння беларусаў у марозны час, запэўнілі ў «Белэнерга».

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДАРУЧЫЎ ВЫРАШЫЦЬ ЖЫЛЛЁВЫЯ ПЫТАННІ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ І РАЗГЛЕДЗЕЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ РОСТУ ЗАРПЛАТ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 6 лютага прыняў з дакладам дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Леаніда Мальцава і міністра абароны Юрыя Жадобіна. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Мяне цікавіць сітуацыя ва Узброеных Сілах, мадэрнізацыя арміі, колькасць у тым ліку, пытанні фінансавання. Другі напрамак, які нам неабходна абмеркаваць, — кадры, грашовае забеспячэнне. І самае галоўнае пытанне — будаўніцтва жылля для ваеннаслужачых. Мы дамаўляліся аб выпрацоўцы пэўнага алгарытму ў гэтым пытанні, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — У сувязі з тым у нас ёсць дамоўленасць з Прэзідэнтам Расіі. Я яму накіраваў пісьмо аб неабходнасці пошуку для беларускіх ваеннаслужачых дадатковых сродкаў за кошт розных напрамкаў супрацоўніцтва Беларусі і Расіі. І ён паабяцаў дапамагчы ў гэтым плане».

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, у дзвюх краін практычна агульная армія і пастаўлены перад ёю задачы. Але памер грашовага забеспячэння ваенных Беларусі і Расіі адрозніваецца. Такое становішча павінна быць зменена, запатрабаваў Прэзідэнт.

Міністр абароны Юрый Жадобін далажыў, што ў цэлым Узброеныя Сілы выконваюць пастаўленыя перад імі задачы. У лістападзе мінулага года праведзены чарговы прызыў грамадзян на тэрміновую ваенную службу і службу ў рэзерве. Леанід Мальцаў адзначыў, што Узброеныя Сілы павінны ўмець процістаяць выклікам і пагрозам у сучасных умовах. Неабходна, каб гэтай задачы адпавядалі іх арганізацыйна-штатная структура, узбраенне, узровень падрыхтоўкі. Аляксандр Лукашэнка даручыў прапрацаваць пытанне павышэння грашовага забеспячэння не толькі ваеннаслужачых, але і супрацоўнікаў усяго сілавога блока. Акрамя таго, дадзена даручэнне вырашыць задачу па забеспячэнні ваеннаслужачых жыллём, у тым ліку службовым, у ваенных гарадках.

# ВІНШАВАННЕ ПРЭЗІДЭНТА

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста Беларусі Віктара Саркісьяна з 65-годдзем.**

Прэзідэнт адзначыў, што вялікі талент і віртуознае валоданне класічнай і сучаснай тэхнікай танца далі магчымасць артысту стварыць незабыўныя вобразы ў спектаклях Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.

«Глыбокай павагі і прызнання заслугоўваюць ваша работа ў якасці балетмайстра-пастаноўшчыка і шматгадовая дзейнасць па выхаванні творчай моладзі, імкненне перадаць ёй вопыт і сакрэты прафесіі», — гаворыцца ў віншаванні.

**26 марта 2012 г. в 16.00 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ»**
**Повестка дня:**
1. Итоги финансово-хозяйственной дятельности общества за 2011 год и основные направления деятельности общества в 2012 г.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков общества за 2011 г.
4. О выплате дивидендов и утверждении распределения прибыли и убытков общества за 2011 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2012 году.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
Местонахождение ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ»: Брестский р-он, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г.
Место проведения собрания: Брестский р-он, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г.
Время регистрации в день проведения собрания с 15.30 до 16.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 06.03.2012 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества. Решение наблюдательного совета (протокол № 17 от 31.01.2012 г.).
*УНП 200034706*

# РОЗГАЛАС
АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

## АЎТАМАБІЛІСТАЎ РАТУЮЦЬ ВАЛАНЦЁРЫ

**Як паведаміў галоўны спецыяліст па надзвычайных сітуацыях Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Дзмітрый Русакоў, за мінулыя выхадныя валанцёры дапамаглі 60 аўтамабілістам, чые машыны сапсаваліся на зімовай трасе ці трапілі ў ДТЗ. Таксама былі выпадкі, калі ратоўвалі адзінокіх пешаходаў, якія замярзалі ў снезе.**

— У сувязі з марозным надвор'ем мы працуем у надзвычайным рэжыме, — паведаміў Дзмітрый Русакоў. — Часам здаралася, што нашы валанцёры аказваліся больш аператыўнымі і прыязджалі на месцы здарэння на некалькі хвілін раней, чым машына хуткай дапамогі.

Вельмі паспрыяла ў гэтай справе тое, што кантакты з ратавальнай брыгадай падтрымліваліся з дапамогай радыёсувязі, у чым дапамагла мінская радыёстанцыя «АўтаКанал». Кожны вадзіцель, чый радыёпрыёмнік быў настроены на іх хвалю, мог паведаміць пра патэнцыяльную ахвяру марозу, якую патрэбна ратаваць.

Акцыя працягнецца да 10 лютага. Калі маразы не адступяць, магчымая і больш позняя дата яе заканчэння.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## МАРАЗЫ ПАВЯЛІЧЫЛІ ЖЫРОЎКІ МІНЧАН НА BR45-50 ТЫС.

**Аб гэтым паведаміў журналістам генеральны дырэктар ДВА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Уладзімір Раянтовіч, перадае БЕЛТА.**

«Што датычыцца платы за ацяпленне, то, паводле разлікаў, паніжэнне тэмпературы на адзін градус павялічвае суму ў жыроўках на 3 тыс. У студзені гэтага года тэмпература была ніжэйшая прыкладна на 15 градусаў адносна студзеня мінулага года, таму плата за ацяпленне будзе вышэйшая», — растлумачыў Уладзімір Раянтовіч.

Ён адзначыў, што з пачатку гэтага года паступіла каля 10 тыс. зваротаў грамадзян са скаргамі на тэмпературны рэжым у кватэрах. Ні адна заяўка не застанецца без увагі, падкрэсліў гендырэктар. Адключэння жылых дамоў ад сістэм ацяплення ў мінулыя выхадныя дні не было, дадаў ён.

## ЖАНЧЫНА ЎПАЛА НА РЭЙКІ НА «КАСТРЫЧНІЦКАЙ»

Здарэнне адбылося 3 лютага на станцыі «Кастрычніцкая». На першы пуць у 20.19 упала, як потым высветлілася, 40-гадовая мінчанка. Ёй раптоўна стала дрэнна. Да 20.23 на гэтым пуці было знята напружанне. Жанчыну на платформу паднялі супрацоўнікі аддзела ўнутраных спраў па ахове Мінскага метрапалітэна. З траўмай каленнага сустава брыгада хуткай дапамогі даставіла пацярпелую ў бальніцу. Такім чынам, і трэцяе здарэнне ў сталічным метро, на шчасце, абышлося без ахвяр.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## Абзац

Па звестках рэсурснага цэнтра Фонду ААН у галіне народанасельніцтва ў Беларусі, у краіне кожныя 2 дні выяўляецца рак шыйкі маткі ў 5 жанчын. Штодзень ад такога дыягназу памірае адна жанчына.

## Поўны абзац

**Кур'ёзнае здарэнне адбылося ў Германіі: кошка зачыніла сваіх гаспадароў на балконе. Тэмпература на вуліцы была ў той час мінус 11 градусаў. Выратаваў зачыненых на балконе сусед, які заўважыў лёгка апранутых людзей, якія мерзлі, і выклікаў паліцыю. Пацярпелыя расказалі, што выйшлі з пакоя ўсяго на некалькі хвілін. У гэты час жывёлка па незразумелых прычынах скокнула на дзверы і зачыніла іх.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

# КОНЕЙ ВЫРАТАВАЛІ

**Раніцай у нядзелю загарэлася канюшня «Агракамбіната «Мір» Баранавіцкага раёна. Да прыезду выратавальнікаў МНС работнікі фермы паспелі выгнаць коней на вуліцу.**

Агонь ліквідавалі хутка. Згарэла 50 кв. м даху, ды пашкоджаны перакрыцці. Пажар узнік ад таго, што канявод адкрытым агнём разаграваў прыборы ацяплення.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОНОВ по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества

**Организатор аукциона:** Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42 61 62.
**Продавец:** Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», тел. (0212) 53 32 96

| № лота | Предмет аукциона, срок договора аренды, наименование, местонахождение недвижимого имущества. Целевое использование. | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1. | Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 12,74 кв.м, расположенного на 3 этаже капитального строения с инв. № 240/С-18515 по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. Ленина, д. 46 для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли. | 111 475 | 11 140 |
| Дата, время и место проведения повторного аукциона: 22.02.2012 в 15.00 г. Орша, ул. Ленина, 46, здание РУПС. Срок подачи документов: с 07.02.2012 с 8.30 по 21.02.2012 до 17.30. Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 12.11.2011 № 216. | | | |
| 1. | Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 6,6 кв.м, расположенного на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26) для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств). | 57 750 | 5 775 |
| Дата, время и место проведения повторного аукциона: 21.02.2012 в 15.00 г. Витебск, проезд Гоголя, 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок подачи документов: с 07.02.2012 с 8.30 по 20.02.2012 до 17.30. Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 26.03.2011 № 56. | | | |

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

1. Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели.

2. Для участия в аукционе в адрес организатора аукциона необходимо представить:
- заявление на участие в аукционе, подписать соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведении аукциона;
- копию платежного документа о внесении задатка на р/с организатора аукциона, заверенную банком;
- юридическому лицу – резиденту Республики Беларусь: копию документа, подтверждающую государственную регистрацию юридического лица; копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
- юридическому лицу – нерезиденту Республики Беларусь: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;
- индивидуальному предпринимателю: копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;
- предъявить: представителем индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

3. Победителем аукциона будет признано лицо, предложившее наиболее высокую цену. Лицам, не выигравшим торги, задаток возвращается.

4. Продавец по результатам проведения аукциона заключает с победителем аукциона (лицом, приравненным к Победителю аукциона) договор аренды здания в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона. Цена продажи предмета аукциона не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством.

5. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона в порядке и размере, указанном в протоколе аукциона.

6. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: № 3012218220012 (в бел. руб.) в Головном филиале по Витебской области ОАО «Белинвестбанк» г. Витебск, ул. Ленина, 22/16, МФО 701, УНП 390477566; № 3012000009469 (в дол. США) в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебск, ул. Гоголя, 8, МФО 150801259, УНП 390477566. При перечислении денежных средств в иностранной валюте расходы по продаже валюты (перевод в белорусские рубли) возмещаются Победителем.

7. **Контактный тел.: (0212) 42 61 62, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by**

## Падрабязнасці

# Забілі яшчэ трох зуброў...

**Такога не было ўжо шмат гадоў запар, калі за непрацяглы час у краіне ад рук браканьераў загінула б столькі лясных волатаў... «Звязда» нядаўна пісала, што 25 студзеня ў Хойніцкім раёне былі знойдзены паралізаваны і мёртвы зубры. Зараз тры «чырванакніжнікі» без галоў былі знойдзены ў Валожынскім раёне.**

Паводле інфармацыі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, на тэрыторыі лесапаляўнічай гаспадаркі «Налібоцкая пушча» былі заўважаны сляды валачэння па снезе трох зуброў. Гэтыя сляды прывялі па падкормачную пляцоўку для дзікоў, што знаходзіцца за 7,5 кіламетра ад месца незаконнага адстрэлу. Побач дзяржінспектары знайшлі тры часткова разабраныя тушы зуброў з адрэзанымі галовамі. Праз дзень пры паўторным аглядзе месца, дзе разбіраліся тушы зуброў, у снезе былі знойдзены і прыхаваныя тры галавы жывёл...

Па гарачых слядах рэдакцыя паспрабавала, наколькі гэта было магчымым, разабрацца ў сітуацыі. На момант падрыхтоўкі гэтага каментарыя да падзей, што адбыліся, нам стала вядома наступнае. Быццам бы ў нашай краіне 27-28 студзеня знаходзілася група расійскіх паляўнічых, для якіх быў арганізаваны паляўнічы тур. Падчас палявання зуброў, якія ляжалі, прынялі за дзікоў... Дарэчы, падобны выпадак ужо здараўся ў Белавежскай пушчы з французскім паляўнічым. Дык вось, адказныя за правядзенне палявання разгубіліся, а калі здарылася тое, што здарылася, паспрабавалі схаваць сляды. А расіяне з'ехалі...

У Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь у дадатак да вышэйвыкладзенай інфармацыі нам дадалі, што ўрон навакольнаму асяроддзю ад незаконнага палявання ацэнены ў 855 базавых велічынь. Гэта амаль 30 мільёнаў рублёў. Заведзена крымінальная справа па артыкуле 282, частцы 4 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь — «Незаконнае паляванне».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

27 марта 2012 г. в 12.00 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».
Повестка дня:
1. Итоги финансово-хозяйстенной деятельности общества за 2011 год и основные направления деятельности общества в 2012 г.
2. Отчет совета директоров общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков общества за 2011 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2011 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2012 году и первом квартале 2013 г.
6. О материальном вознаграждении членов совета директоров и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов совета директоров и ревизионной комиссии.
Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Базановой, 19.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Базановой, 19.
Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 07.03.2012 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества. Решение совета директоров (протокол № 49 от 30.01.2012 г.).
*УНП 200050191*

# КВАТЭРЫ ЁСЦЬ, КВАТЭР НЯМА



**Кожны дзень, ідучы дахаты, я праходжу вялікі глыбокі катлаван. Раней тут стаялі тры аднапавярховыя драўляныя дамы. Жыхароў з іх выселілі, і закіпела праца. Панаехала будаўнікоў, дамы знеслі, вырылі катлаван, пачалі заліваць бетонны падмурак, узводзіць першы паверх... Аднойчы тут усё сціхла. Будаўнікі зніклі, застаўся толькі вялікі рэкламны шчыт, на якім красаваўся, прыкрываючы ўвесь квартал, малюнак вялікага пяціпавярховага жылога дома, што павінен быў тут узнікаць. Застаўся і глыбокі катлаван, які ўвечары становіцца змрочным і пагрозлівым. І ўсё гэта адбывалася не дзе-небудзь на далёкіх ускраінах, а ў цэнтры прэстыжнага раёна літоўскай сталіцы. І вось ужо чацвёрты год тут нічога не мяняецца. Толькі пампезны шчыт знік. Ці то ветрам яго здзьмула, ці то самі будаўнікі вырашылі не цвяліць жыхароў.**

Праходзячы міма гэтага катлавана, я не магу не задумацца і пра стан нашага жыллёвага будаўніцтва. А ён даволі трывожны. У Вільнюсе ўсё радзей можна ўбачыць дзейны будаўнічы кран. У іншых раёнах Літвы — тым больш.

Вось сухая статыстыка. За 1990 год у Літве было пабудавана 22 100 кватэр. У 2001 — ужо толькі 3 785. Пасля аб'ёмы будаўніцтва жылля паволі павялічваліся. Але, пачынаючы з 2009 года, сталі рэзка зніжацца. У 2010-м было пабудавана толькі 3 667 кватэр — то бок, нават менш, чым у 2001-м. Звестак за мінулы год пакуль няма, але вялікіх змен там не чакаецца.

Прычына такой сумнай сітуацыі — фінансава-эканамічны крызіс, які распачаўся. Ён вельмі сур'ёзна ўдарыў і па будаўнічым сектары, і, асабліва, па нашых кішэнях.

— На шчасце, падчас крызісу можна было карыстацца сродкамі ЕС. Калі б іх не было, банкруцтва не пазбеглі б прыкладна 60 адсоткаў будаўнічых кампаній. А так абанкруцілася толькі 30 адсоткаў, — кажа **прэзідэнт Асацыяцыі будаўнікоў Літвы Адактас ШАШТАКАЎСКАС.**

У Літве ўжо даўно няма дзяржаўных будаўнічых арганізацый. А прыватныя фірмы не настолькі моцныя, каб маглі будаваць, не зважаючы на хістанні рынку збыту. Маўляў, пабудуем, а пасля як-небудзь прададзім кватэры. Так не атрымліваецца. Статыстыка паказвае, што цяпер у Вільнюсе пустуе каля 2 000 новапабудаваных кватэр, якія яшчэ не прададзены. У Каўнасе такіх кватэр каля 400, але там і будуюць нашмат менш.

Грошы замарожаны, аддачы няма, няма і жадання пачынаць новае будаўніцтва. Тым больш што і банкі насцярожыліся, вельмі неахвотна даюць пазыкі для будаўнічых фірмаў. Калі будзеш будаваць жыллё ў перспектыўным раёне Вільнюса, яшчэ можаш разлічваць на прыхільнасць банка. А калі задумаў будаваць на ўскраіне ці, крый Божа, у якім-небудзь далёкім раёне Літвы, надзея атрымаць пазыку становіцца мізэрнай.

Надзеі на павелічэнне аб'ёмаў будаўніцтва жылля змяншае і палітыка Банка Літвы. Перасцерагаючы прыватныя банкі ад валюнтарызму, з леташняга лістапада ён вырашыў забараніць ім выдаваць пазыкі на будаўніцтва жылля, калі ў будаўнікоў не назапашана 15 адсоткаў кошту будаўніцтва. А непрадодзеныя кватэры не дазваляюць назбіраць патрэбныя сумы грошай.

Хто-небудзь можа сказаць, што няма каму іх засяляць, бо каля паловы мільёна маладых грамадзян Літвы эмігравала ў іншыя краіны ў пошуку добрых заробкаў. Так, эмігравала, і гэта адчувальна, але ахвотнікаў набыць сваё жыллё яшчэ вельмі шмат. Толькі яны не могуць купіць кватэру.

Я вывучыў цэны на новыя кватэры. Яны вагаюцца ад 1300 — 1500 долараў за квадратны метр на ўскраінах Вільнюса да больш як 3500 долараў за квадратны метр у прэстыжным раёне сталіцы.

Новыя кватэры шмат гадоў даражэлі, бо рос кошт будаўнічых матэрыялаў, сантэхнікі, зямельных участкаў, павышаліся заробкі будаўнікоў. Ну, і самі фірмы накручвалі цану, нават тады, калі якасць новага жылля станавілася ўсё горшай. На якасць работ уплывала не толькі імкненне хутчэй здаць дамы, «пракруціць» грошы, але і аб'ектыўныя прычыны. Аднымі з першых за мяжу па вялікія заробкі рушылі высокакваліфікаваныя будаўнікі. Паводле слоў прэзідэнта Асацыяцыі будаўнікоў Літвы А.Шаштакаўскаса, за мяжу выехала амаль 50 тысяч высокакваліфікаваных будаўнікоў. Іх месца займае нявопытная моладзь, якую яшчэ трэба доўга вучыць.

Відаць, таму нашы будаўнікі прыдумалі новаўвядзенне — сталі прадаваць неўладкаваныя кватэрныя каробкі. Узводзяць толькі сцены, перакрыцці. А ўсё астатняе — устаноўку сантэхнікі, падлогі, унутраных дзвярэй, пабелку сцен, столяў — пакідаюць заканчваць новаму гаспадару кватэры.

Пакупнікі, якія пераважна ўзялі пазыкі ў банках, былі, але да таго часу, пакуль не пачаўся крызіс. Банкі раней выдавалі пазыкі пад заклад будучых кватэр даволі свабодна, нават падахвочвалі. Крызіс разваліў гэты картачны домік. Многім быў зменшаны заробак, усім урэзаны пенсіі, некаторыя наогул засталіся без работы. Расплачвацца за банкаўскія пазыкі стала нашмат цяжэй, павісла пагроза непажаданых візітаў судовых прыставаў.

Калі банкі ў адпаведнасці з падпісанымі дагаворамі паднацісьнуць на сваіх даўжнікоў, яны могуць стаць самымі буйнымі ўласнікамі жылля. Але ім столькі кватэр без жыхароў таксама не патрэбна. Пераважна яны адкладваюць плацяжы, ствараюць умовы для даўжнікоў, каб тыя выкараскаліся самі і рубяць з пляча толькі ў безвыхадных сітуацыях.

А што рабіць маладым, якія жадаюць жыць самастойна? Грошай яны не назбіралі, банкаўскую пазыку атрымаць амаль немагчыма. Застаецца адна надзея — станавіцца ў чаргу на арэнду сацыяльнага жылля.

У Літве дзейнічае дзяржаўная праграма па забеспячэнні маламаёмных сацыяльным жыллём. Для іх будуюцца шматпавярховыя дамы, і кватэры здаюцца ў арэнду. Але аб'ёмы гэтай праграмы невялікія, а цяперашні крызіс звузіў яе яшчэ больш.

— З 2004 года было пабудавана толькі 2915 кватэр у рамках праграмы сацыяльнага жылля. Такія тэмпы будаўніцтва не могуць забяспечыць сацыяльным жыллём усіх, хто мае ў ім патрэбу. А аб'ёмы будаўніцтва пакідаюць жадаць лепшага, — кажа загадчык аддзела жылля Дэпартамента будаўніцтва і жылля Э.Радавічэне.

Колькасць ахвотнікаў атрымаць такія кватэры, наадварот, істотна павялічваецца. Паводле звестак Дэпартамента статыстыкі Літвы, у 2006 годзе ў чарзе на сацыяльнае жыллё было 16 314 чалавек, а ў 2010 годзе — ужо 26 461 чалавек.

— У канцы мінулага года намецілася невялікае ажыўленне ў будаўнічым сектары. Гэта радуе, і працэнт росту здаецца вялікім. Аднак не варта забывацца, у якую яму мы трапілі. У 2009 годзе аб'ёмы будаўнічых работ зменшыліся ажно на 50 адсоткаў. У 2010 годзе спад склаў яшчэ 5 адсоткаў. Мы толькі пачалі выкарасквацца з гэтай вялікай ямы, — адзначае А.Шаштакаўскас.

Калі нашы будаўнікі жылля выкарасквацца з гэтай вялікай ямы? На жаль, пакуль эксперты не абяцаюць нічога суцяшальнага на бліжэйшы час.

**Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,**
**уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве. Фота аўтара.**
*Вільнюс.*

Погляд

# ЕЎРАСТАНДАРТНЫ ХОД

## Рэзалюцыя ПАСЕ сведчыць пра тое, што палітыка на беларускім кірунку зайшла ў тупік

**Чарговая рэзалюцыя Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы, якая крытыкуе палітычную сістэму Беларусі, не стала чымсьці нечаканым для афіцыйнага Мінска, працягваючы нядобрую традыцыю беларуска-еўрапейскіх адносін, якая склалася ў апошнія гады.**

Прыняцце чарговага дакумента такога роду сведчыць пра некалькі рэчаў. Па-першае, пра тое, што еўрапейская палітыка на беларускім кірунку зайшла ў відавочны тупік. Па-другое, пра тое, што беларуская тэма для Еўрапейскага саюза з'яўляецца другараднай і ў цяперашні момант ЕС не мае ні сіл, ні часу, ні жадання шукаць выйсце з тупіка, які склаўся, працягваючы па інерцыі штампаваць дзяжурныя і малазначныя дакументы.

Тупік, які склаўся ў беларуска-еўрапейскіх адносінах, узнік далёка не сёння. У многім ён абмеркаваны надзвычай тэндэнцыйнай і ангажыраванай пазіцыяй ЕС, які адмовіўся ад ролі прынцыповага і бесстаронняга знешняга назіральніка ў адносінах з Беларуссю. Выбар гэты быў зроблены еўрапейскімі ўладамі ўжо даўно, у далёкім 1996 годзе, калі ў разгар унутрыпалітычнага крызісу ў Беларусі Еўропа кансалідавана выступіла на баку апазіцыі. У далейшым ЕС упарта працягваў гэтую лінію, усяляк падтрымліваючы тых, хто называе сябе беларускай апазіцыяй, і гледзячы на сітуацыю ў краіне іх вачыма.

Бясспрэчна, тыя, хто называе сябе беларускімі апазіцыянерамі, складаюць пэўную частку беларускага сацыяльна-палітычнага ландшафту. Аднак наколькі значная гэтая частка? Адказваючы на гэта пытанне, аб'ядналая Еўропа чамусьці прыйшла да высновы, што гэта найбольш значны сегмент беларускага грамадства, калі не ўсё грамадства цалкам, спісваючы перманентныя палітычныя правалы апазіцыі выключна на аўтарытарызм і недэмакратычнасць беларускіх улад. Даволі дзіўная здагадка, калі ўлічыць, што Беларусь знаходзіцца не дзесьці на сусветнай перыферыі, а ў цэнтры Еўропы, пад бокам у таго ж Еўрасаюза, што ўжо само па сабе робіць утрыманне ўлады выключна шляхам аўтарытарнага гвалту і палітычных махінацый недазвольнай раскошай. У чым жа тады прычына такога прадузятага стаўлення Еўропы да беларускіх рэалій?

Безумоўна, беларуская апазіцыя, якая вызнае ідэалагічны «кактэйль» з празаходняга лібералізму і этнічнага нацыяналізму (розныя групоўкі — у розных прапорцыях), з'яўляецца найбольш блізкім па светапоглядзе і зручным партнёрам для Еўрапейскага саюза, што робіць прыярытэтнае супрацоўніцтва еўрапейскіх структур з гэтым сегментам па-свойму заканамерным і зразумелым. Падзеі 1996 года, у выніку якіх беларуская апазіцыя выглядала прайграўшай, «пакрыўджаным» бокам, таксама відавочна спрыялі росту сімпатый і спачування да яе ў еўрапейскіх калідорах. Такая сітуацыя парадаксальным чынам стала выгаднай апазіцыйным функцыянерам, якія, па сутнасці, у абход афіцыйных каналаў беларускага МЗС манапалізавалі вектар беларуска-еўрапейскіх адносін, стаўшы «вачыма і вушамі» Еўрасаюза ў Беларусі.

Аднак рэальная эфектыўнасць і ўплывовасць беларускай апазіцыі аказаліся далёкімі ад чаканых Еўрасаюзам. Пра ўнутраную згуртаванасць розных апазіцыйных груповак і іх здольнасць дамаўляцца красамоўна сведчыць нядаўні камічны эпізод, калі адзін апазіцыйны лідар даў важкага выспятка другому апазіцыйнаму лідару. Акрамя таго, перманентная еўрапейская дапамога, як высветлілася, вельмі разбэшчвае апазіцыйныя структуры, у выніку чаго быць вечным апазіцыянерам, які жыве на еўрапейскія гранты, для многіх стала камфортным і прывабным modus vivendi.

Усё гэта ў сукупнасці і прывяло да таго тупіку, у якім апынулася еўрапейская палітыка ў выніку манапалізацыі беларуска-еўрапейскіх адносін беларускай апазіцыяй. Аднак нейкіх перамен у палітыцы ЕС наўрад ці варта чакаць, і звязана гэта з унутраным крызісам як эканамічнага, так і палітыка-ідэалагічнага характару, які перажывае гэтая арганізацыя.

Экспансіянісцкая палітыка ЕС, звязаная з эйфарыяй пасля «халоднай вайны» і імкненнем многіх постсацыялістычных краін далучыцца да заходніх структур, засталася ў мінулым; апошнім, і ўжо вельмі нязграбным яе акордам можна лічыць «аранжавую рэвалюцыю» ва Украіне. Перамоўнае пашырэнне ЕС на ўсход зрабіла гэтую арганізацыю занадта стракатай і разнароднай, да чаго яе бюракратычныя структуры з невыразнымі і часта недастатковымі паўнамоцтвамі аказаліся папросту не гатовы. Апроч таго, эканамічны крызіс, які распачаўся, выявіў, што ў выніку пашырэння ЕС набыў вельмі шмат праблемных актываў, у ліку якіх апынуліся не толькі новыя краіны постсацыялістычнага блока (Румынія, Балгарыя, Венгрыя), але і, здавалася б, праверавыя «старыя» члены — Грэцыя, Італія, Іспанія, Партугалія. З прычыны гэтых абставін чакаць ад Еўрасаюза нейкай знешняй актыўнасці з мэтай інтэграцыі ці якіх-небудзь іншых формаў уцягвання новых краін наўрад ці варта. Уласна, пра гэта красамоўна сведчыць і фактычны правал ініцыятывы «Усходняе партнёрства».

На беларускім кірунку ў найбліжэйшыя гады ад Еўропы не варта чакаць нічога, апроч дзяжурных, інерцыйных і малазначных акцый накшталт нядаўна прынятай рэзалюцыі ПАСЕ.

**Усевалад ШЫМАЎ,**
**кандыдат палітычных навук, дацэнт кафедры паліталогіі БДУ.**

# Сёлета ў Беларусі будзе пабудавана больш за 4 млн $м^2$ жылля

*У складаных умовах функцыянавання эканомікі летась арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці было пабудавана 68,3 тысячы новых кватэр (у 2010 годзе — 84,7 тысячы). Усяго за мінулы год уведзена ў эксплуатацыю 5 млн 487 тысяч квадратных метраў жылля, паведамілі рэдакцыі ў Нацыянальным статыстычным камітэце Беларусі.*

Спецыялісты адзначаюць, што летась макраэканамічная палітыка дзяржавы была накіравана на стрымліванне інфляцыйных працэсаў і патрабавала аптымізацыі аб'ёмаў крэдытавання жыллёвага будаўніцтва. Таму агульны ўзровень фінансавання будаўніцтва жылля і аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры быў паменшаны на 1 трлн 585 млрд рублёў, адбылося прыпыненне льготнага крэдытавання грамадзян у чэрвені, жніўні і кастрычніку 2011 года. Менавіта таму мінулагодняе заданне па ўводзе ў эксплуатацыю жылля было выканана толькі на 75,4 працэнта. Разам з тым, тут трэба адзначыць, што летась для асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў было пабудавана 3 млн 498,4 тысячы квадратных метраў жылля, з іх у шматкватэрных жылых дамах гарадоў — 2 млн 648,5 тысячы квадратаў.

Белстат асабліва падкрэслівае той факт, што ўдзельная вага жылля, пабудаванага для чаргавікоў у гарадскіх шматкватэрных дамах, склала 85,3 працэнта ад аб'ёму жылля ў такіх дамах пры заданні на год — 80 працэнтаў. У сельскай мясцовасці было ўведзена ў эксплуатацыю 1 млн 289,2 тысячы квадратных метраў жылля, або 23,5 працэнта ад агульнага ўводу па краіне.

Нагадаем, што сёлета ў краіне запланавана ўвесці ў эксплуатацыю не менш як 4,2 млн квадратных метраў жылля. Разам з тым, адпаведнай пастановай Савета Міністраў прадугледжваецца, што ў 2012 годзе ў сельскай мясцовасці з падтрымкай дзяржавы будзе пабудавана 1020 жылых дамоў (кватэр) для мясцовых чаргавікоў. Усяго на фінансаванне будаўніцтва агульнай плошчы жылля і аб'ектаў інжынерна-транспартнай інфраструктуры па краіне сёлета плануецца накіраваць 7,5 трлн рублёў.

Гэтымі днямі эксперты Мінбудархітэктуры распрацоўваюць канцэпцыю фарміравання дзяржаўнага заказу на жыллё для грамадзян, якія маюць права на дзяржпадтрымку. Адначасова разглядаюцца і іншыя формы развіцця жыллёвага будаўніцтва. Паралельна з сістэмай жыллёвых будзберажэнняў і іпатэкай, у будаўнічай галіне ёсць і іншыя актуальныя метады прыцягнення сродкаў у сферу жылля. Напрыклад, перспектыўным лічыцца кірунак па будаўніцтве арэнднага жылля. На 2012 год у краіне запланавана пабудаваць каля 26 тысяч квадратных метраў такога жылля.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Імпрэза

# ПЭЎНЫ ТОН

## У Заслаўі беларускую культуру вызначалі гукамі і фарбамі

**МАРОЗІК кусаецца, але сонца. Ёсць у гэтым гармонія, якая не дае засумаваць і трымае ў тонусе. Тон, танальнасць, тонус — тое, што мацуе чалавека і дазваляе яму адчуць, што ён жыве. І што можа гэтае жыццё ўпрыгожыць сам. І ніякія жудасныя маразы не перашкодзяць, калі ёсць жаданне нешта стварыць ці дакрануцца да стварэння. І хто сказаў, што гэта можна рабіць толькі ў сталіцы, дзе нібыта віруе жыццё?..**
**Свята музыкі, якое адбываецца кожную зіму ў Заслаўі ўжо дванаццаць гадоў, дае магчымасць дакрануцца да творчасці не толькі тым, хто яе прывозіць у гэты старажытны горад па волі мастацкага кіраўніка прафесара Міхаіла Фінберга. Свята гэтае ў нейкім сэнсе інтэрактыўнае. Калі ты на яго прыйшоў, то ўжо прыйдзецца ў яго ўвайсці, паглыбіцца і далучыцца ўласнымі пачуццямі. А то і дзеяннямі.**

### ТОН

За вокнамі — зіхатлівы белы. Затое буйства фарбаў на выставе ў Заслаўскай дзіцячай школе мастацтваў. Мастак Віктар Ціханаў ладзіць майстар-клас літаральна на вачах у прысутных. Яны далучаюцца — могуць узяць пэндзаль і рознымі фарбамі пакідаць мазкі ад сябе асабіста. Асабліва шчыруюць дзеці: калі яшчэ будзе такая магчымасць паўдзельнічаць у стварэнні сапраўднай карціны? Белае палатно пакрываецца плямкамі: хлопчык пакінуў зімовы блакіт у кутку, маленькае дзяўчо дадае сонечны жоўты па ўсёй карціне — у спалучэнні ўсё падобна на сённяшні дзень. Пакуль незразумела, што атрымаецца: усе колеры існуюць нібыта асобна. Але чым больш людзей падыходзіць да мальберта і бярэцца за пэндзаль, тым больш разумееш: штосьці вымалёўваецца. Агульнымі намаганнямі, пад кіраўніцтвам майстра, які адным рухам рукі ўмудраецца звязаць усе featured рознакаляровыя плямкі пэўным сюжэтам. Атрымліваецца арганічна.

Для Заслаўя арганіка яшчэ і ў тым, што Майстра прапануе творчы дыялог. Адна справа — прывезці і выставіць карціны. Але прыадкрыць таямніцу таго, як яны ўзнікаюць, паказаць, што любы чалавек, у прынцыпе, можа быць стваральнікам, што кожны мазок на палатне — гэта як кожны след у жыцці: усё невыпадкова, усё патрабуе думкі (дзе і як гэты след пакінуць), усё патрабуе гармоніі (што, як і ў якіх прапорцыях спалучыць). Але пакуль усё неакрэслена, людзі стаяць у чарзе, каб узяць пэндзаль. А Майстра назірае і чакае часу, калі ў асобных штрыхах убачыць вобраз і звяжа розныя колеры, ператварыўшы відавочны хаос у стройны момант жыцця. Усё-такі ён аўтар, але дае магчымасць кожнаму, хто пажадае, пакінуць свой след у мастацтве.

### ТАНАЛЬНАСЦЬ

Услед за фарбамі за справу бяруцца гукі. І ў вонкавай маўклівасці белага дня ты ўлоўліваеш асобную мелодыю. Гукі падаюць у паветра, як колеры на палатно. І ты разумееш, што ў іх таксама няма выпадковасці, што і тут усё падуладнае Майстру.

Сёлета Майстрам, чыя музыка гучала ў Заслаўі, быў Леў Абеліёвіч. Кампазітар XX стагоддзя, лёсам якога стала менавіта Беларусь. Ураджэнец Вільні, чалавек, які пачынаў як музыкант выхоўвацца ў Варшаве, але ў 1939-м годзе прыйшоў у Мінск, ратуючыся ад фашыстаў. Беларусь яго не толькі ўратавала, але дала магчымасць раскрыць свой талент. Ён шчодра аддзячыў. Творчая спадчына Абеліёвіча ўзбагаціла беларускую сімфанічную музыку, якая з'яўляецца паказчыкам вышыні, сусветнага ўзроўню культуры краіны. Мы можам казаць пра высокі ўзровень, які забяспечылі кампазітары мінулага стагоддзя. Але казаць — адно. Іншая справа, гэты ўзровень дэманстраваць і тым самым сведчыць пра яго. Для гэтага патрэбны канцэрты, дзе б гучала гэтая музыка. Але іх амаль няма. З задавальненнем слухаючы сусветную музычную класіку, мы такім чынам застаёмся адлучанымі ад сваёй класікі. І гэта, напэўна, не зусім справядліва ў адносінах да саміх сябе: ці можа быць народ без мінулага? Без культурнага мінулага, якое ўвасабляе багацце і самавітасць гэтага народа?

Таму я буду заўсёды дзякаваць тым музыкантам, якія бяруцца іграць музыку, якая не папулярная, і пра яе шмат хто не ведае наогул. Буду дзякаваць хоць бы за сам факт таго, што бяруцца яе іграць. Сімфанічны аркестр Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі і малыя ансамблі, якія існуюць у яго складзе, прадставілі творы Льва Абеліёвіча, якому сёлата споўнілася б 100 гадоў.

Так, ужо сёння варта нагадваць музычны твар XX стагоддзя, лічыць прафесар, даследчык музыкі Вольга Дадзіёмава:

— Мы жывём у час разрыву традыцый, адбываецца змена эпох. — Мы нібыта імкнёмся наперад, што натуральна. Але важна падчас такога імкнення не згубіць мінулага. Я кажу гэта, узгадваючы, як мы вярталі музыку мінулых эпох, пра якую краіна на доўгі час забылася: Агінскага, Карловіча, Казлоўскага, Радзівілаў і іншых кампазітараў, якіх нават перасталі ўспрымаць як нашых. Дык ціпер можа скласціся сітуацыя, што тое ж здарыцца з музычнай спадчынай XX стагоддзя. Яна можа стаць Атлантыдай, якую калі-небудзь прыйдзецца вяртаць з небыцця. Але гэтыя фестывалі, імпрэзы, дзе ёсць магчымасць выконваць беларускую музыку, усё-такі не дазваляюць забываць. Тут выхоўваецца моладзь: сярод выканаўцаў і сярод слухачоў. На мой погляд, інстынкт працягу больш важны, чым інстынкт самазахавання. Таму што працяг дае падмурак для будучыні.



Музыканты Нацыянальнага канцэртнага акестра Беларусі пад кіраўніцтвам М. Фінберга.

### ТОНУС

Працяг — гэта і маленькія музыканты, якія сёння толькі вучацца ў музычных школках. Але і для іх ужо ладзяцца конкурсы, іх слухаюць прафесійныя музыканты, даюць парады і адзначаюць лепшых. Маленькія дзеці ехалі ў Заслаўе ў такі мароз, каб іграць музыку на конкурсе! Іх мамы ехалі разам з імі, можа, не толькі таму, што спадзяваліся на ўзнагароды і адзнакі, на граматы і добрыя словы. Напэўна, сярод гэтых людзей (малых і дарослых) ёсць сапраўды тыя, хто дзеля творчасці гатовы цярпець, гатовы шмат часу займацца, каб усё-такі лепш разумець гэтую загадкавую музыку. Сёлета менавіта яны — маленькія музыканты — у Заслаўскай школе мастацтваў стварылі ўяўленне пра будучыню, напоўнілі свята музыкай рухам. Яны пакуль атрымалі свае граматы. Але, можа, неўзабаве станучь атрымліваць узнагароды міжнародных конкурсаў. Галоўнае, што, аднойчы паслухаўшы тых, хто супрацьстаіць музычнаму забыццю, яны не будуць задумвацца пра тое, што калі музыка напісана, то яна павінна гучаць.

— Мы даўно маглі паставіць кропку ў справе вяртання імёнаў, значных для беларускай культуры, — гаворыць Міхаіл Фінберг. — Але чым больш працуеш, тым больш разумееш, што ёсць пра што размаўляць. Мы павінны рабіць так, каб наша музычная спадчына гучала ў залах. Нашаму калектыву сёлета 25 гадоў. Вялікая частка нашага жыцця прысвечана менавіта выступленням у малых гарадах Беларусі, дзе людзі накіраваны на культурныя адкрыцці і з задавальненнем прыходзяць на канцэрты. Гэтае выступленне ў Заслаўі — 140-е па ліку, якое мы праводзім у малых гарадах. А сёлета іх колькасць павялічыцца: мы далучым да музычнага жыцця яшчэ і Горкі, дзе шмат студэнтаў, ёсць вышэйшая навучальная ўстанова, значыць, павінна быць культурнае жыццё для людзей, якія неўзабаве пачнуць працаваць дзеля краіны. Наша імпрэза мае навуковы падмурак, бо акрамя таго, што іграем музыку, імкнёмся яе прадставіць у кантэксце — гістарычным (калі прафесар Вольга Дадзіёмава распавядае пра кампазітараў і іх час) і сучасным, калі нашы суайчыннікі могуць убачыць тым, што створана ў беларускай музыцы. Гэта даволі дзейсная формула, нездарма мы бачым вынік: сёння на нашы канцэрты прыводзяць сваіх дзяцей тыя, хто сам яшчэ дзіцем наведваў першыя нашы фестывалі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**




АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

**WWW.RLT.BY**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Логойского райпо (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:**

**Лот № 1:** здание столовой (инв. № 601/С-13333), об. пл. 846,9 кв.м, расположенное по адресу: Минская область, г. Логойск, ул. Победы, д. 85. Начальная цена с НДС (снижена на 20%) – 400 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,2226 га (предоставлен продавцу на праве аренды).

**Лот № 2:** административно-хозяйственное здание (инв. № 601/С-13081), об. пл. 119,3 кв.м, расположенное по адресу: Минская область, г. Логойск, ул. Первомайская, д. 26. Начальная цена с НДС (снижена на 10%) – 90 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,0916 га (предоставлен продавцу на праве аренды).

**Лот № 3:** здание информационно-диспетчерской службы (инв. № 601/С-13105), об. пл. 68,4 кв.м; здание бухгалтерии (инв. № 601/С-13078), об. пл. 81,9 кв.м, расположенные по адресу: Минская область, г. Логойск, ул. Первомайская, 26. Начальная цена с НДС (снижена на 10%) – 90 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,0983 га (предоставлен продавцу на праве аренды).

**Лоты № 2 и № 3 обременены договорами аренды.**

Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

**Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.**

*Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Народная газета» от 21.12.2011.*

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора аукциона www.rlt.by.**

Аукцион состоится **22.02.2012 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 21.02.2012 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**


# ГРАДУС ДАБРЫНІ

ШТОЗІМУ ў гэтым месцы вадасховішча назіраецца падобная карціна. Калі навокал лёдам скаваны ўсе вадаёмы і незамерзлай застаецца толькі крынічная палонка, да яе імкнуцца лебедзі і качкі, якія засталіся на зімоўку. Сёлета зляцеліся каля 70 лебедзяў і амаль 3 тысячы качак. Сталічныя арнітолагі ўзялі пад належны кантроль гэтую крылатую калонію, сочаць за станам птушак. А падкормку шмат гадоў здзяйсняе Мінская лесапаркавая гаспадарка. Як толькі слупок тэрмометра дасягае адзнакі мінус 15 і ніжэй, супрацоўнікі ўстановы спяшаюцца сюды з мяхамі корму.

— Кожны год набываем 5-8 тон зерняадходаў для падтрымкі птушак, якія застаюцца на зімоўку, — кажа начальнік службы па ахове і абароне лесу гэтай паркавай гаспадаркі Канстанцін Пузына. — Увесь мінулы тыдзень кожную раніцу і нават увечары прывозілі птушкам нарыхтаваную загадзя падмацоўку. Нягледзячы на тое, што жыхары горада таксама клапоцяцца пра іх. Паколькі птушак вялікая колькасць, ежы ім таксама трэба шмат.

Не часта даводзіцца назіраць гэткае птушынае скопішча. Здзіўляе і колькасць птушак, і іхняя прыродная прыгажосць, і незвычайнае белае зімовае атачэнне. Птушкі сваім рухам не даюць палонцы звузіцца. Пакуль ім гэта ўдаецца. Але невядома, якія яшчэ сюрпрызы можа падкінуць зіма. Гэта насцярожвае. Таму без нагляду палонку пакідаць яшчэ нельга.

Кранае неабыякавасць людзей. Вось яшчэ адзін прыклад праявы гэтай рысы.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**

*Мінскі раён.*



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



# ВЯЛІКІ СНЕГ

**ДВА ДНІ, СУБОТУ І НЯДЗЕЛЮ, НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ БЕСПЕРАПЫННА ІШОЎ СНЕГ**

**Пасля адчувальных марозных удараў мінулага тыдня вобласць завалiла снегам. На раніцу панядзелка вышыня снежнага покрыва ў рэгіёне дасягала месцамі 48 сантыметраў.**

На вуліцах Магілёва, безумоўна, не суцэльная снежная цаліна, але блізка да гэтага. Навокал — сумёты, на дарозе — снежная каша. Вадзіцелі, якія пакінулі свае аўтамабілі на стаянках у выхадныя дні, у панядзелак вымушаны былі ехаць на працу. Многія не рызыкавалі і рабілі стаўку на грамадскі транспарт, аднак і з ім здараліся перабоі.

Аўтобусы буксавалі ў снезе, пад якім лёд. Тралейбусы курсіравалі з затрымкамі ў раскладзе. Аднак людзі разумеюць складанасць сітуацыі, як і тое, што з цягам часу яна нармалізуецца.

З вуліц абласнога цэнтра толькі за два выхадныя дні вывезена 25 тысяч «кубоў» снегу. У дарожна-маставым прадпрыемстве камунтоўцы, што працуюць суткамі без перапынку, уся магчымая тэхніка «на лініі».

Слізкія дарогі сталі прычынай шэрагу дарожна-транспартных здарэнняў.

Гэтымі снежнымі і марознымі днямі людзі імкнуліся радзей выходзіць на вуліцы, — напэўна таму колькасць пацыентаў у Магілёўскім траўмапункце паменшылася.

**Ілона ІВАНОВА.**

Супрацоўніцтва

# ВЫГАДНАЯ ЎЗАЕМАДАПАЎНЯЛЬНАСЦЬ



**Для гутаркі пра беларуска-венесуэльскія стасункі, якія за рэкордны час і наперакор дыстанцыі дараслі да стратэгічнага партнёрства, асаблівай нагоды не трэба. Праектаў заўжды багата, эканомікі ўдала дапаўняюць адна адну. Венесуэльцы, да прыкладу, даюць беларусам доступ да энергарэсурсаў, беларусы — перадаюць будаўнічыя тэхналогіі. Але званне ганаровага госця XIX Мінскай міжнароднай выставы-кірмашу, якое сёлета належыць Венесуэле, і 15-я гадавіна ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі — усё ж прыемная падстава для размовы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Венесуэлы ў Беларусі Амерыка Дыясам НУНЬЕСАМ. З яе мы даведаемся, якія сатырыкі могуць сабе дазволіць гумар пра венесуэльскага прэзідэнта, што зараз чытае пасол і чаго больш у двухбаковых нафтагазавых дамоўленасцях — эканомікі ці палітыкі.**

***— Чым здзівіце кнігалюбаў, спадар пасол?***

— Да XIX Мінскай міжнароднай выставы-кірмашу мы падрыхтавалі спецыяльны падарунак — выданне на рускай мове фотаальбома пра поўдзень Венесуэлы, адзін з самых старажытных і ўнікальных ландшафтаў у свеце. Кніга называецца «Венесуэла: зачараванне поўдня». Яе прэзентацыя адбудзецца на адкрыцці выставы. Спадзяёмся, гэта стане прыемным сюрпрызам для многіх. Размова ідзе пра раскошнае выданне, у якім прадстаўлены багаты навукова-пазнавальны матэрыял, а таксама сотні фотаздымкаў прафесіянала найвышэйшага класа, якi прысвяціў шмат гадоў вывучэнню паўднёвай часткі Венесуэлы і называў сябе «вандроўнікам трапічных лясоў».

***— Беларусам, натуральна, хочацца пабачыць на свае вочы экзатычныя краявіды. А наколькі цікава венесуэльцам дэманстраваць свае культурныя набыткі на другім канцы свету?***

— Нягледзячы на істотную геаграфічную адлегласць паміж Венесуэлай і Беларуссю, наш удзел у Мінскай кніжнай выставе ў якасці краіны, ганаровага госця, выклікаў вялікі інтарэс у Венесуэле. Менавіта дзякуючы яму мы зможам прэзентаваць сваю краіну некалькімі тонамі друкаванай прадукцыі розных выдавецтваў і дзяржаўных устаноў. У цяперашні час дзяржава з'яўляецца адным з найбуйнейшых выдаўцоў у Венесуэле. Мяркую, у 2012 годзе нам удасца інтэнсіфікаваць адносіны ў галіне культуры.

***— Спадар Пасол, падзяліцеся, калі ласка, з нашымі чытачамі ўласнымі літаратурнымі густамі.***

— Штодня я чытаю розную літаратуру, асабліва падабаюцца мне гістарычныя творы, сучасная палітычная літаратура і сацыялагічныя нарысы, якія тлумачаць працэсы, што адбываюцца ў свеце. Зараз я чытаю «Гумар у адказ на гумар». Аўтары гэтага аб'ёмнага тома — венесуэльскія сатырыкі, якія пішуць пра прэзідэнта Уга Чавеса. Адзін з іх, Раберта Эрнандэс Мантоя, будзе госцем выставы. А другі, Раберта Малавер, наведаў Беларусь у канцы мінулага года і ўзяў удзел у адным з мерапрыемстваў пасольства. Гэта тыповы венесуэльскі гумар.

***— З тыпова венесуэльскім гумарам ды пазітывам працуе таксама Лацінаамерыканскі культурны цэнтр імя Сімона Балівара ў Мінску, дзе вывучае іспанскую мову і журналіст «Звязды». Чым парадуеце прыхільнікаў сёлета?***

— Цэнтр, магчыма, адзін з самых лепшых узораў арганізацыі работы Пасольства ў культурнай сферы. Мы змаглі аб'яднаць на добраахвотнай аснове беларускую моладзь, якая прасякнулася нашымі гісторыка-культурнымі традыцыямі і каштоўнасцямі. Гэта дазваляе нам разлічваць на цёплы прыём беларускай публікі, што з'яўляецца адной з нашых асноўных мэт. Як вядома, абодва творчыя калектывы Лацінаамерыканскага культурнага цэнтра імя Сімона Балівара пад кіраўніцтвам прафесійнага музыканта Херарда Эстрады складаюцца з беларускіх юнакоў і дзяўчат, якія прыйшлі сюды па ўласнай ініцыятыве. Самыя значныя праекты Культурнага цэнтра ў 2012 годзе будуць звязаны ў рамках нашых магчымасцяў з арганізацыяй мастацкіх выстаў венесуэльскіх аўтараў і гастроляў тэатральных калектываў ды аркестраў у Беларусі.

***— Не духоўнасцю адзінай мацуюцца стасункі краін, нельга забывацца і на «хлеб» надзённы. У кантэксце беларуска-венесуэльскіх адносін гэта нафта. Ці працягнуцца сёлета прамыя пастаўкі венесуэльскай нафты і пастаўкі азербайджанскай нафты па своп-схеме і ў якіх аб'ёмах? Як зменіцца аб'ём здабычы на тэрыторыі Венесуэлы з удзелам беларускага боку?***

— У нафтавай сферы ўсё ідзе без змен. Дасягнутыя дамоўленасці будуць выконвацца, як і раней. Сёлета ў Венесуэле плануецца павялічыць здабычу нафты да 3,5 млн барэляў у дзень, актывізаваўшы вытворчасць у нафтаносным поясе ракі Арынока, дзе знаходзяцца самыя вялікія разведаныя запасы «чорнага золата» ў свеце. У планах сумеснага прадпрыемства «Петралера Белавенесалана» — павялічыць здабычу за кошт леташняга далучэння дзейных нафтавых скважын і свідравання новых. Агучваць лічбы — у кампетэнцыі прадпрыемства. У цяперашні момант я не валодаю гэтай інфармацыяй.

***— Што чуваць наконт трохбаковага праекта па здабычы нафты сумесна з Кітаем?***

— Прэзідэнт Чавес нядаўна зрабіў заяву адносна сумесных планаў па развіцці нафтавай галіны з удзелам Кітая, якая ў самы блізкі час будзе канкрэтызавана.

***— А як справы з распрацоўкай газавых радовішчаў? На якой стадыі будаўніцтва ЦЭЦ у Венесуэле?***

— Пра сумеснае з Беларуссю асваенне радовішчаў прыроднага газу, магчыма, стане вядома падчас візіту Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ў Венесуэлу. Нельга забывацца на тое, што гэты праект прадугледжвае значныя інвестыцыі, бо прыродны газ знаходзіцца на марскім шэльфе. Каб ажыццявіць яго, Беларусі, магчыма, спатрэбіцца час на аднаўленне пасля фінансавага крызісу. Дакладнай інфармацыяй я не валодаю — пра гэта павінен паведаміць беларускі бок. Рэалізацыя ўсіх астатніх праектаў вядзецца паскоранымі тэмпамі.

***— Узаемадзеянне Беларусі і Венесуэлы ў энергетычным сектары часта абвінавачваюць у эканамічнай немэтазгоднасці. Дык чаго там усё ж такі больш — эканомікі ці палітыкі?***

— У супрацоўніцтве паміж Беларуссю і Венесуэлай у сферы энергетыкі галоўную ролю адыгрывае ўзаемнае імкненне ўмацаваць незалежнасць абедзвюх краін для забеспячэння дабрабыту народаў. Мы называем гэта эканамічнай і палітычнай узаемадапаўняльнасцю. Абодва бакі атрымліваюць выгаду, што абвяргае домыслы аб яго немэтазгоднасці ці меркаванай нерацыянальнасці. Немагчыма падтрымліваць эканамічныя адносіны ў доўгатэрміновай перспектыве, калі яны не ўзаемавыгадныя.

**Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Уга Чавеса з 15-годдзем устанаўлення дыпадносін паміж Беларуссю і Венесуэлай**

**Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Балівaрыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Рафаэля Чавеса Фрыяса і венесуэльскі народ з 15-годдзем устанаўлення дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі. Аб гэтым паведамілі ў прэсслужбе беларускага лідара.**

«За час, які прайшоў з пачатку афіцыйных кантактаў паміж нашымі краінамі, зроблена вельмі шмат: забяспечана высокая інтэнсіўнасць палітычнага дыялога, падпісаны ўзаемавыгадныя пагадненні, якія пацвярджаюць стратэгічны характар двухбаковых адносін, наладжаны пастаянныя сувязі прадстаўнікоў дзелавых колаў», — адзначаецца ў віншаванні. Прэзідэнт выказаў перакананне, што і ў далейшым супрацоўніцтва Беларусі і Венесуэлы будзе ўзбагачацца новымі канкрэтнымі праектамі ў сферы гандлю, інвестыцый, нафтаздабычы, будаўніцтва, навукі і культуры, прадоўжыцца плённае ўзаемадзеянне на міжнароднай арэне.

***— Беларусам таксама ёсць што прапанаваць венесуэльскаму боку. Будаўнічыя тэхналогіі, напрыклад. Як прасоўваецца ўзвядзенне на тэрыторыі Венесуэлы жылля, аграгарадкоў з удзелам беларускіх спецыялістаў?***

— Што датычыцца будаўніцтва жылля і аграгарадкоў, нядаўна прэзідэнт Чавес у сваёй праграме «Алё, прэзідэнт!» праінфармаваў пра дасягненні ў рэалізацыі абодвух праектаў. Наша пасольства выдала бясплатныя візы сотням беларускіх спецыялістаў, якія адпраўляліся ў Венесуэлу для завяршэння будаўніцтва кватэр у сектары Гуасімаль у Маракаі.

***— Спадар пасол, калі можна чакаць запуску зборачных прадпрыемстваў беларускай тэхнікі ў Венесуэле з удзелам двух прэзідэнтаў?***

— Паводле звестак, якія даюць асобы, адказныя за рэалізацыю праектаў, зборачныя вытворчасці трактароў і грузавых аўтамабіляў у Барынасе знаходзяцца ў высокай ступені гатоўнасці: падрыхтавана 90—100 адсоткаў базавай інфраструктуры, уключаючы электрычныя сеткі і ўнутраную транспартную сетку. Частка тэхнічнага персаналу прайшла стажыроўку ў Беларусі на базе прадпрыемстваў «МАЗ» і «МТЗ». Наколькі мне вядома, у найбліжэйшы час адбудзецца ўвод прадпрыемстваў у эксплуатацыю з удзелам абодвух прэзідэнтаў — у даты, якія будуць імі вызначаны.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества | Лот №1 – капитальное строение с инвентарным номером 200/С-45296 (гаражи) стоимостью 308 011 200 рублей. |
| Собственник (владелец) имущества | ГПРСКУП «Витебскоблремстрой» |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Витебск, ул. Серова, 21 |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Витебск, ул. «Правды», 32, каб. 318 24.02.2012 в 11:00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Хозяйственный суд Витебской области: 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 318, http:// vitebsk.court.by/ тел./факс. (8 0212) 49 13 45, (8 029) 366 40 15 судебный исполнитель Бураков Игорь Вячеславович, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (8 0212) 49 13 40 (8 044) 746 73 00 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 17:00 23.02.2012. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

На кантролі

# Эфект нечаканасці

**СТАРШЫНЯ Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь Аляксандр Якабсон нечакана асабіста ўзяў удзел у маніторынгу працы гандлю глыбінкі. Зайшоў у краму ў гарадскім пасёлку Відзы Браслаўскага раёна і пацікавіўся: «А дзе ў вас рыба ў продажы?» Як высветлілася, рыба вэнджаная, як і рыба жывая, адсутнічалі. Больш за тое, у краме некалькі дзён не працавала халадзільная вітрына для рыбнай прадукцыі.**

Гэта, як потым устанавілі візіцёры, стала следствам непрыняцця своечасовых мер па рамонце абсталявання. Адпаведная заяўка была пададзена толькі ў дзень наведвання кантралёраў. Апошнія ўстанавілі і нясвоечасовы завоз тавараў. На час маніторынгу ў гэтай краме райпа (№ 65) у продажы таксама адсутнічалі сыры мяккія і дрожджы. Не ў поўным асартыменце была прадстаўлена кісламалочная прадукцыя. У дапаможным памяшканні ў спецыяльнай халадзільнай скрыні захоўваліся разам марожанае і мясныя паўфабрыкаты, а мяшок з цукрам стаяў на падлозе.

У краме № 44 у гарадскім пасёлку Друя ў продажы адсутнічалі яйкі, цукар, сухарныя вырабы, дрожджы. У краме № 41 у вёсцы Опса не знайшлося на паліцах цыбулі, буракоў і морквы. І бульбы таксама, хаця на складзе яна была. Не прадаваліся смятана і тварог з нізкім утрыманнем тлушчу, дрожджы, грэцкія крупы.

Вынікі маніторынгу былі разгледжаны з удзелам спецыялістаў Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці на апаратыўнай нарадзе ў старшыні Браслаўскага райвыканкама і на пасяджэнні праўлення Браслаўскага райпа. Да дысцыплінарнай адказнасці прыцягнулі дваццаць чалавек.

### АЎТАЛАЎКУ ЧАКАЛІ... МЕСЯЦ

Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці ўважліва сочаць за сітуацыяй на спажывецкім рынку. Мякка кажучы, праца крам сістэмы спажывецкай кааперацыі не радуе. Нягледзячы на тое, што дзяржавай штогод аказваецца падтрымка прадпрыемствам гэтай сістэмы, парушэнні ў сферы гандлю спажывецкай кааперацыі вобласці па-ранейшаму носяць масавы характар. Але ні райвыканкамамі, ні аблспажывсаюзам не прыняты сур'ёзныя меры па кардынальным вырашэнні гэтай праблемы.

Кантралёры летась устанавілі, што незбалансаванасць паміж попытам і прапанавай тавараў ва ўмовах нестабільнага валютнага рынку і вывазу тавараў з рэспублікі прыводзіла да перабояў з забеспячэннем таварамі. Адсутнічала і дакладнае ўзаемадзеянне гандлю з вытворцамі. Вытворцы неаператыўна рэагавалі на змяненне попыту, не выконвалі ў поўным аб'ёме і ў тэрмін заяўкі гандлёвых арганізацый. Пры гэтым, як устаноўлена праверкамі, не ўсе мясцовыя органы ўлады надавалі належную ўвагу пытанням насычэння спажывецкага рынку.

Летась ва ўсіх з 230 правераных гандлёвых аб'ектаў Віцебскай вобласці былі ўстаноўлены парушэнні заканадаўства пры абслугоўванні спажыўцоў. У тым ліку на 162 — не выконваліся патрабаванні да якасці тавараў. У 136 крамах парушаліся санітарныя нормы і правілы.

Не могуць не абураць і вынікі праверак арганізацый бытавога абслугоўвання сельскага насельніцтва. Не арганізавана прадстаўленне дробных бытавых паслуг сельскім жыхарам непасрэдна на месцах у комплексных прыёмных пунктах, вымушае жадаць лепшага пералік бытавых паслуг. Слаба праводзіцца праца па зборы заявак на прадастаўленне бытавых паслуг шляхам падворавага абходу сельскіх жыхароў, асабліва пажылых людзей. Не практыкуюцца прыём і дастаўка заказаў непасрэдна на дом.

Кантралёры ўстанавілі, што не забяспечваецца і выкананне сацыяльнага стандарту па выязным абслугоўванні сельскага насельніцтва ў малых населеных пунктах. Напрыклад, Полацкаму камунальнаму ўнітарнаму прадпрыемству бытавога абслугоўвання «Полацкрайбыт» у 2010 годзе і пачатку мінулага года для ўводу ў эксплуатацыю ў чатырох аграгарадках комплексных прыёмных пунктаў выдаткавана 183 мільёны рублёў. Аднак іх дзейнасць аказалася неэфектыўнай: сярэднямесячная выручка ад прадастаўлення паслуг у гэтых пунктах летась склала ўсяго ад 150 тысяч да 970 тысяч рублёў. Прадпрыемствам не забяспечана выкананне сацыяльнага стандарту па выязным абслугоўванні сельскіх населеных пунктаў з колькасцю жыхароў больш за 100 чалавек. А яно павінна ажыццяўляцца па графіку — не радзей за адзін раз у два тыдні. Асобныя населеныя пункты з колькасцю насельніцтва да 430 чалавек на працягу месяца не абслугоўваліся ні разу.

### УСІХ З КРАМЫ ЗВОЛЬНІЛІ

Па выніках праверак гандлёвай дзейнасці і сферы паслуг летась Камітэтам дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 490 правапарушальнікаў з накладаннем штрафаў на суму 56,9 мільёна рублёў. Да дысцыплінарнай адказнасці прыцягнуты каля 380 чалавек, у тым ліку 10 чалавек звольнена.

Цікава, што па выніках маніторынгу, праведзенага ў краме «Мірт», што ў пасёлку Асінторф Дубровенскага раёна, увесь калектыў крамы быў расфарміраваны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Усе хваробы — ад прыхільнасцяў?

**На пытанні чытачоў і слухачоў адказала загадчыца аддзялення традыцыйнай кітайскай медыцыны Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння, урач-рэфлексатэрапеўт Таццяна ДРАНІЧНІКАВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 4 лютага.)*

**«Звязда»:** ***Як доўга можа працягвацца лячэнне?***

— Зразумела, у шэрагу выпадкаў патрабуецца некалькі курсаў, бо спачатку мы проста зніжаем інтэнсіўнасць болю, а далей дабіваемся таго, каб прыступы сталі больш рэдкімі. Адзін сеанс доўжыцца каля 30 хвілін. Як правіла, адзін курс — не менш за 10 сеансаў. Паўторныя курсы прызначаюцца ў залежнасці ад захворвання. Перапынак паміж курсамі можа складаць пару тыдняў ці месяцаў.

**«Звязда»:** ***Што патрабуецца ад пацыента падчас такога лячэння?***

— Безумоўна, проста рэгулярна хадзіць да нас недастаткова. У любым выпадку неабходна прытрымлівацца здаровага ладу жыцця, у тым ліку мець на ўвазе навакольныя фактары. Скажам, вядома, што вецер, холад, вільготнасць спрыяюць аслабленню імунітэту. Няправільнае харчаванне, нізкая фізічная актыўнасць, негатыўныя эмоцыі, стрэс — усё гэта зніжае ахоўныя сілы арганізма — менавіта тую энергію, якая працякае па нашых энергетычных каналах.

**«Звязда»:** ***Пазітыўныя эмацыйныя ўзрушэнні таксама могуць спрыяць парушэнню току энергіі?***

— Вялікая радасць — таксама стрэс, а значыць, і дысбаланс энергіі. Лепш імкнуцца да раўнавагі. Нездарма кітайцы рэгулярна займаюцца спецыяльнай дыхальнай гімнастыкай з плаўнымі, размеранымі рухамі, каб энергія спакойна цякла ў арганізме... Дарэчы, кітайцы а 6-й гадзіне — усе ў парках, на стадыёнах займаюцца сістэмнай гімнастыкай. Але ёю трэба займацца не час ад часу, а пастаянна, і на першым этапе пад кіраўніцтвам спецыяліста. Спецыялісты, якія валодаюць такой методыкай, ёсць і ў Беларусі...

Кітайцы яшчэ кажуць, што ўсе няшчасці і хваробы — ад прыхільнасцяў. Найперш матэрыяльным каштоўнасцям. Для нармальнага жыцця чалавек павінен адчуваць сябе ўнутрана свабодным. Тады ў яго будзе належны запас энергіі і бясцэнная здароўе.

***☎— Мінская вобласць, Ала. Цікава, а дзе, акрамя вашага цэнтра, можна атрымаць усходняе лячэнне?***

— Рэфлексатэрапеўты ёсць у раённых, гарадскіх паліклініках, шэрагу санаторыяў. А вось аддзяленне традыцыйнай кітайскай медыцыны ёсць толькі ў нас.

***— Як іголкатэрапія спалучаецца з тэрапіяй медыкаментознай?***

— У самым пачатку мы не спяшаемся рэкамендаваць адмаўленне ад прапісаных прэпаратаў. Аднак з цягам часу пасля кансультацыі з урачом-тэрапеўтам або іншым вузкім спецыялістам (скажам, кардыёлагам, калі размова ідзе пра артэрыяльную гіпертанію) можна рэгуляваць дозу лекаў. Калі мы гаворым пра болевы сіндром пры хваробе пазваночніка, то часам чалавек наогул перастае прымаць лекі для абязбольвання.

***☎— Віцебск, Кацярына. Рэфлексатэрапія можа праводзіцца толькі ва ўмовах стацыянара або існуе і які-небудзь хатні варыянт?***

— Так, мы прымяняем карэйскі метад лячэння — суджок-тэрапію. Яна прадугледжвае ўздзеянне на кропкі, якія размяшчаюцца на кісцях рук, дзе, як і на вушах, знаходзяцца выхады каналаў усіх органаў. На кропкі кісцей рук ставяцца маленькія іголкі, затым — спецыяльныя магнікі. Гэта вельмі падыходзіць дзецям... Урач тлумачыць, па якой схеме, праз які час трэба адзець і зняць гэтыя магнікі. Такім чынам таксама можна лячыць розныя хваробы.

***— Ці трэба прыходзіць да вас адразу з гатовым дыягназам або яго можа паставіць рэфлексатэрапеўт?***

— Лепш загадзя абследавацца і ведаць свой дыягназ. Для спіны, суставаў можна зрабіць, напрыклад, магнітна-рэзанансную тамаграфію. Усё ж такі нам трэба бачыць памер паражэння таго ж дыска, асаблівасці грыжы, у які бок яна выпінаецца. Аднак у кітайскай медыцыне ёсць і свае метады дыягностыкі — гэта, напрыклад, вегатэст, або метад Фоля. Сутнасць такой методыкі ў тым, каб выявіць пашкоджаны канал і орган. Мы робім такую дыягностыку, напрыклад, пры наяўнасці алергіі. Часам чалавек абследуецца, у яго ўсё нібыта ў норме, а праявы хваробы ёсць. Алергія, як правіла, цесным чынам звязана з захворваннямі страўнікава-кішачнага тракту. Але што менавіта пашкоджана — страўнік, падстраўнікавая залоза, жоўцевы пузыр, печань?.. Біярэзанансная методыка дазваляе ўбачыць, у якім з органаў мае быць напружанне. Далей лячэнне можа ажыццяўляцца як з дапамогай іголкатэрапіі, так і з дапамогай эндагенная біярэзанансная тэрапіі. Урач-гамеапат, які звычайна і праводзіць дыягностыку па метадзе Фоля, прызначае гамеапатычнае лячэнне — спецыяльна зараджаную крупку або ваду. Паступова стан нармалізуецца.

***☎— Мінск, Таццяна Ільінічна. У іголкарэфлексатэрапіі ёсць некалькі метадаў... А які з іх найбольш эфектыўны?***

— Уласна іголкарэфлексатэрапія — гэта традыцыйная кітайская медыцына. На кропку акупунктуры можна ўздзейнічаць не толькі іголкай, як гэта рабілі два тысячагоддзі таму, але і лазерам, і электрычным токам, ёсць вакуумная акупунктура, фармакатэрапія. Пры фармакатэрапіі мы не проста ўздзейнічаем на кропку, але і ўводзім пры гэтым лекавы сродак. Прымяняецца яшчэ прыпальванне палыновымі моксамі. Спецыяліст кожнаму пацыенту індывідуальна вызначае, з якога метаду лепш пачаць і якім чынам працягнуць лячэнне.

У Кітаі, напрыклад, вельмі шырока прымяняецца электраакупунктура, аднак лазерапунктуры ў іх няма. А мы яе выкарыстоўваем вельмі актыўна. Лазерапунктура добра лечыць дыскагенныя радыкуліты, коксартрозы. І нават нашы беларускія лазерныя апараты добра спраўляюцца са зняццем болю такога кшталту. Электрапунктура забяспечвае аддалены эфект, лазерная акупунктура дзейнічае больш хутка.

***— А можна проста памасажыраваць кропкі для аблягчэння стану падчас прастуды, паляпшэння самаадчування?***

— Так, самастойны масаж цалкам можа быць. Калі з'явіўся насмарк, можна аказаць уздзеянне на кропку Хэ-гу, якая знаходзіцца паміж вялікім і ўказальным пальцамі левай і правай рук. Неабходна на працягу хвіліны памасажыраваць спачатку кропку на адной руцэ, затым на другой. Націскаць трэба моцна, каб з'явілася непрыемнае цягнучае адчуванне. Далей варта аднachasова прамасажыраваць кропкі, якія знаходзяцца на ўзроўні крылаў носа. Уздзеянне на іх дапаможа нам умацаваць імунітэт, а значыць, і зняць праявы насмарку.

***— Якія кропкі дапамогуць актывізавацца, пазбавіцца кволасці, апатыі?***

— Можна масажыраваць тыя ж кропкі Хэ-гу. Уздзеяннем на адну кропку можна лячыць некалькі захворванняў... За зняцце болю ў сэрцы адказвае кропка Шэнь-мэнь, якая знаходзіцца ля запясця, каля мезенца, у складцы, калі рука згінаецца. Масажыраваць трэба па стрэлцы гадзінніка, на правай і левай руках... Многа кропак на вушах — тут «адлюстраваны» фактычна ўсе органы... Масаж вуха зверху ўніз і знізу ўверх дазваляе ўзняць агульны тонус, палепшыць настрой.

***☎— Брагін, Уладзімір. Неўроз навязлівых станаў, шызатыповае расстройства, вельмі зніжаная самаарганізацыя. 2 група інваліднасці. Ці можна мне рэкамендаваць іголкатэрапію?***

— Я мяркую, вам можна паспрабаваць прайсці ўсходняе лячэнне. Спатрэбіцца, вядома, не адзін курс, і, можа, нават не адзін год. Поўнасцю вас вылечыць мы не зможам, але аблегчыць стан, думаю, здолеем.

***☎— Мінск, Ірына Уладзіленаўна. 59 гадоў. Ужо некалькі гадоў пакутую ад болю ў спіне — у мяне астэахандроз ніжняга аддзела пазваночніка. Ці можна пры гэтым захворванні прымяняць іголкатэрапію? Колькі будзе доўжыцца лячэнне?***

— Вам не толькі можна, але і неабходна выкарыстоўваць іголкарэфлексатэрапію. Яна вельмі добра дапамагае пры захворваннях пазваночніка. Гэта будзе некалькі курсаў лячэння. Прычым тут можна прымяняць не толькі класічную іголкарэфлексатэрапію, але і фармака-, лазерарэфлексатэрапію.

***☎— Мінск, Святлана. У мяне ў шыйным аддзеле пазваночніка — грыжа. Што вы параіце?***

— Вам вельмі добра падыдуць нашы метады. Прычым і класічнае ўздзеянне іголкамі, і фармакатэрапія, і лазерапунктура, і вакуумная тэрапія.

***☎— Гродзенская вобласць, Ірына. З дапамогай якога метаду рэфлексатэрапіі можна нармалізаваць вагу, знізіць апетыт?***

— Класічную іголкарэфлексатэрапію можна спалучаць разам з вакуумнай рэфлексатэрапіяй і электраакупунктурай... На вуху ёсць дзве кропкі, якія зніжаюць апетыт. Метад уздзеяння на іх называецца аўрыкарэфлексатэрапіяй. Урач замацоўвае іголкі на гэтых кропках, а ад пацыента патрабуецца націсканне на іх кожных паўгадзіны. Такім чынам зніжаецца апетыт. Безумоўна, гэта не лічыцца эфектыўным, калі чалавек не будзе прытрымлівацца дыеты, больш рухацца і ў цэлым не памяняе свой лад жыцця. Хадзіць на іголкі і есці булачкі не атрымаецца.

***☎— Мінск, Ганна. 12 гадоў таму у мяне была анкалогія па шчытападобнай залозе. Зараз няма інфармацыі па прагрэсаванні захворвання. Ці можна мне прайсці іголкатэрапію па прычыне астэахандрозу, неўрозу?***

— Вядома, можна. Проціпаказаннем з'яўляецца толькі наяўнасць пухліны. Калі ж анкалогія мела месца некалькі гадоў таму, пацыент атрымаў належнае лячэнне, то ўсходняя медыцына не проціпаказана.

***☎— Верхнядзвінск, Антаніна Аляксандраўна. Ці можна з дапамогай усходняй медыцыны дыягнаставаць захворванні?***

— Можна. Для гэтага існуе метад Фоля, калі спецыяліст-гамеапат па кропках акупунктуры выяўляе разбалансаваныя каналы і праблемныя органы. Такі спецыяліст працуе і ў нашым цэнтры. Калі ласка, можаце пазваніць і запісацца на прыём.

***☎— Мінск, Ларыса Паўлаўна, 64 гады. Пакутую ад дэфармуючага артрозу каленнага сустава. Чым мне можна дапамагчы?***

— Сярод іншых метадаў іголкарэфлексатэрапіі вам падыдзе лазерапунктура, фармакарэфлексатэрапія, калі з дапамогай увядзення лекавага прэпарата мы будзем дабівацца паляпшэння харчавання храстка, знімем запаленне і ацёк.

***☎— Гомель, Ала Андрэеўна. Ці прымяняецца ўсходняя медыцына для лячэння анкалагічных захворванняў? Ці можа яна прымяняцца для лячэння іншых хвароб пасля перанесенага раку цела маткі?***

— Іголкарэфлексатэрапіяй нельга лячыць анкалогію. Іншая справа, калі орган з пухлінай выдалены, калі на працягу пяці гадоў пасля гэтага няма рэцыдыву. Тады можна звяртацца і да ўсходняй медыцыны.

***☎— Мінская вобласць, Таццяна Віктараўна, 58 гадоў. Які курс лячэння вы парэкамендавалі б мне для пазбаўлення ад эмацыйнага напружання, для добрага сну? Зараз я прымаю лячэнне, прапісанае мне неўролагам. Аднак, напэўна, нельга ўвесь час сядзець на таблетках...***

— Усходняя медыцына дапамагае пры такіх станах. Акрамя таго, у нас ёсць і іншыя спадарожныя метады аказання дапамогі — напрыклад, крыясаўна. Лячэнне холадам запускае механізм работы мікрасасудаў, што дае штуршок для паляпшэння мікрацыркуляцыі, і вельмі добра дапамагае пры неўрозах. Добра падыходзіць і азонатэрапія, якая таксама ёсць у нашым цэнтры. Фізраствор узбагачаюць азонам і ставяць крапельніцу. Такім чынам, кроў насычаецца азонам і гэта аднachasова прафілактуе інфаркты і інсульты.

***☎— Мінск, Таццяна. Дзіцяці — 3,5 года. Часта здараюцца рыніты, фарынгіты. Ці можа тут дапамагчы ўсходняя медыцына?***

— Можна прымяняць суджок-тэрапію, паставіць на кісці спецыяльныя магнікі, якія будуць аднаўляць абарончыя сілы арганізма. Добра будзе і папіць курсам азанаваную ваду.

***— У чым можа заключацца лячэнне бясплоднасці?***

— Спатрэбіцца некалькі курсаў на працягу не аднаго года. Але тут важная і прычына бясплоднасці. Класічныя іголкі і прыпальванне палыновымі мопсамі дапамажа пры дысгарманальных парушэннях, калі ёсць парушэнне авуляцыі, гарманальныя скачкі. Уздзеянне ідзе на канал падстраўнікавай залозы, нырак, печані, а таксама на органы малога таза — агульны канал, які ў тым ліку нясе генную энергію і адказвае за дзетанараджэнне.

***— А як да вас трапіць?***

— Калі ласка, звяніце па нумары: 263 81 89. Запіс звычайна робіцца на два тыдні наперад. У нашым аддзяленні працуе чатыры чалавекі. Усе прайшлі стажыроўку ў Кітаі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

БЕЛМЕТАЛЛ

Первый и основной поставщик металлопроката

Оптовая и розничная торговля металлопрокатом, метизной продукцией и строительными материалами

- ТРУБЫ вгп, эл/св, проф, х/д, г/д, нержавеющие
- ЛИСТ г/к, х/к, оцинкованный
- АРМАТУРА кл AI, A III, A500C
- БАЛКА
- ШВЕЛЛЕР
- УГОЛОК
- КРУГ
- ШЕСТИГРАННИК
- КВАДРАТ
- ПОЛОСА
- ПРОВОЛОКА
- КАНАТЫ
- ЭЛЕКТРОДЫ СВАРОЧНЫЕ



Тел./факс в г. Минске 299-47-26, 346-22-06

Тел./факс в г. Бобруйске (8-0225) 43-26-10 моб. 8 044 7727125

Тел./факс в г. Гродно (8-0152) 56-07-85 моб. 8 044 7727113

Тел./факс в г. Орша (8-0216) 21-84-18, 21-83-38 моб. 8 029 1545949

Окажем услуги (017) 344-56-12 (017) 344-87-82

- Разметка, правка и резка буxтовой арматуры
- Рубка, гибка, резка металлопроката в размер
- Изготовление металлоконструкций по чертежам заказчика

220075 г.Минск пр. Партизанский, 174 к.301

E-mail: belmetall@mail.by

www.belmetall.com

УНП 400010817

**УП «Гомельоблсоюзпечать»**
**ОТКАЗЫВАЕТСЯ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**
**по продаже объектов государственной собственности, назначенного на 09 февраля 2012 г. (11.00) по продаже предмета аукциона:**

1. Автомобиль ГАЗ-2705, государственный номер ЕА 8538, год ввода в эксплуатацию 1999 г.
2. Автомобиль ГАЗ-3307, государственный номер ЕА 8537, год ввода в эксплуатацию 1999 г.

*Извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 27.01.2012 № 17.*

**У суд Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **Севастопалева Пятра Андрэевіча**, 1927 года нараджэння, апошняе месца жыхарства: в. Бухавічы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці, які пайшоў з дому ў 1951 годзе, пасля чаго звестак пра яго не паступала. Просім грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Севастопалева Пятра Андрэевіча, паведаміць іх суду Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

## СУТЫКНЕННЕ

**У Талачынскім раёне на аўтадарозе Брэст—Масква каля вёскі Новая Будаўка ў выніку аварыі два чалавека загінулі, пяць былі траўміраваны.**



Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях, каля адзінаццатай гадзіны раніцы сутыкнуліся «Мерседэс» з украінскім нумарам і грузавік «МАН» (Рэспубліка Малдова), якія ехалі ў адным кірунку. У «Мерседэсе» знаходзілася дзевяць чалавек. У выніку ДТЗ у гэтай машыне загінулі двое мужчын — грамадзяне Украіны 1970 і 1968 гадоў нараджэння, траўміраваны пяць... Траўміраваныя былі дастаўлены брыгадамі «хуткай» у Талачынскую цэнтральную раённую бальніцу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# НА ВЕЧНУЮ ПАМЯЦЬ

*...Гэтай зімы баба Лена зусім не баялася — нават трохі чакала, бо на згон мінулай па зніжках купіла зручныя, цёплыя боты, мела добрую шапку, паліто, а на вялікія маразы — хай старое, але ж натуральнае футра.*

*Надоечы, праслухаўшы прагноз надвор'я, вырашыла дастаць яго з шафы (ну, каб пад рукамі ўжо было), павесіць у вітальні. І... ледзьве не самлела: замест футра на вешалцы быў... каўнер і два рукавы. Усё астатняе — што «панадкусвала», што зусім з'ела моль.*

*— І бачыла ж, — узгадвала потым гаспадыня, — лёталі зрэдку... Маленечкія такія істоткі!.. Хто б мог падумаць, што вялікае футра з'ядуць?*

*...Наша прыказка: на смачны кусочак знойдзецца раточак.*

## КОЛА

У цырульню зарана прыйшла — хвілін з дзесяць трэба чакаць... Што не бяды, як кажуць, бо ў сумцы — добрая кніжка, над галавой — уключаны тэлевізар, да таго ж, цікава паглядзець на працу майстрых.

У адной, прынамсі, ну вельмі прыгожая кліентка: каб яшчэ больш, дык на халеру, здавалася б! Але ж, мусіць, будзе, бо якраз цяпер — майстрыха шчыруе над броўкамі: робіць так званую карэкцыю... Робіць умела, робіць старанна і, мяркуючы па ўсім, удала, бо дзяўчына, падняўшыся з крэсла, смела ідзе да люстэрка, з цікавасцю разглядае тое, што атрымалася (гладзіць новыя дужкі броваў), задаволена прастуе да касы, каб аплаціць паслугу.

Але і пасля гэтага з цырульні не сыходзіць: вяртаецца назад да майстрыхі — на столік перад ёй кладзе свой... дзякуй (у выглядзе дзвюх паперак па пяць тысяч).

— Калі ласка, — усміхаецца тая і як нічога ніякага грошы бярэ.

Што хоць-нехаць «дыктуе» думкі.

Так, гэта ўжо за правіла — маючы альбо не маючы, давацць «на чай» афіцыянтам і таксістам, на каньяк (як мінімум) дактарам, на шакаладныя цукеркі медсёстрам, на падарункі выхавацелям у дзіцячых садках, настаўнікам у школах... А далей — болей, кола пашыраецца: касметолагам, цырульнікам, манікюркам...

Тым, каму, як лічыцца, плаціць мала.

...Ад тых, каму плаціць шмат?

## ДВА Ў АДНЫМ

Сталіца, гастраном, адзін з цэннікаў: «Яйцо дыетычнае». Кошт — 920 рублёў.

За што, даходзіць не адразу — пасля падказкі:

— Во, брат, — чухае патыліцу нейкі дзядок, што стаіць паблізу, — мусіць, прайшлі часы, калі каўбасы мы бралі палкамі, а яйкі — дзясяткамі? Цяпер, бач, і па адным ужо можна.

...Што падаецца цалкам лагічным, нават разумным, бо не заўсёды ж патрэбен дзясятак?

І пры гэтым — чамусьці крыўдным.

## АД СЛОВА!

Анекдот: капітан турэцкага судна загадаў Рабіновічу неадкладна надраіць палубу і, пачуўшы ў адказ: «Ага, шчас!», задаволены пайшоў далей.

Быль: дзвюх замежных моў гэтай дзяўчыне мала было — узялася вывучаць трэцюю: села за падручнікі, запісалася на курсы.

Але не менш, чым выкладчыкі, дапамог ёй сапраўдны немец, які прыехаў да іх на фірму. Днём ён працаваў з перакладчыцай, а вось па вечарах... Менавіта ёй, Любцы (так «карта лягла») даверылі паказваць госцю сталіцу, вадзіць па музеях і тэатрах, знаёміць з людзьмі. А яна і рада была: паказвала і расказвала, вадзіла і знаёміла. У тым ліку (ён так захацеў) — са сваімі бацькамі, сябрамі, са сваім жаніхом.

Яны (што трохі дзіўна было, бо вельмі ж розныя...) адразу ўпадабалі адзін аднаго, знайшлі агульную мову, цудоўна кантактавалі. Ды што там — цвёрда рашылі, што будуць сябраваць... Дамамі.

І немец сваё слова стрымаў: адразу ж пасля ад'езду запрасіў іх прыехаць — да яго, дамоў.

Любка — магла (у яе заставаўся з тыдзень адпачынку), жаніх яе — не: праца, ды і грошай не бог ведае колькі...

Але ж гэта ён настаяў, каб яна паехала (хай адна... На першы раз), каб раззнаёмілася там з жонкай і дзецьмі новага сябра, каб адпачыла, пабачыла іншую краіну, купіла вясельную сукенку, папрактыкавала мову. Гэта ён даводзіў ёй, што дзесяць дзён (плюс выхадныя...) — не тэрмін, што час праляціць хутка. Гэта ён абяцаў, што будзе чакаць і сустракаць яе...

Не, не падмануў: сапраўды сустрэў, але... з «чартапалохам» — з балючым, як удар бізуна, пытаннем:

— Ты з ім была?

Дзеўка не адразу дапяла, пра што ён? А калі дайшло, знямела — ад крыўды, ад абразы, бо за каго ж яе трэба было трымаць, каб падумаць...

Хацела спытаць... І ўжо пачала — з кароткага:

— Ну канешне...

А далей ён слухаць не стаў: пад ногі ёй кінуў кветкі, сеў у машыну, з'ехаў...

Хоць (як потым казаў) анічога перад сабою не бачыў, не разумеў куды: проста гойсаў па горадзе, наразаў кругі. Аж пакуль не скончыўся бензін.

А калі ўбачыў, дзе (ён скончыўся), рашыў, што вось гэта — боскае наканаванне, лёс. Бо менавіта тут, на вуліцы Алтайскай, жыла дзяўчына, якая (ён дакладна ведаў) шчыра кахала яго — ці не з першага класа.

Ён лёгка адшукаў яе дом, пазваніў у дзверы. Яна — бясконца шчаслівая — павісла ў яго на шыі...

Але ж назаўтра, раніцай, ён Любцы званіў. Паслязаўтра — таксама. Потым стаў прыязджаць...

Праз тыдзень-другі яны такі пагаварылі, праз месяц-другі — здаецца, памірыліся: сталі сустракацца зноў, але ўжо нядоўга, бо высветлілася, што тая, з вуліцы Алтайскай, цяжарная, чакае дзіця.

Воляй-няволяй ён ажаніўся. У іх цяпер двое дзяцей.

У Любкі па-ранейшаму нікога.

Ад слова?

## ЯК ЗМАЛКУ...

Нарадзіўшыся ў беднай, шматдзетнай сям'і, гэтая жанчына вельмі шмат працавала, вельмі шмат чаго ўмела, але ўсё жыццё жыла ў нястачы: шыла і перашывала, вязала і перавязвала, абыходзілася без неабходнага, эканоміла кожны рубель.

Толькі нядаўна, у старасці, можна сказаць, патрэба ў гэтым нарэшце адпала, бо, не могучы больш гарбаціцца (працаваць на зямлі), яна прадала ўсё ж бацькаву хату (пад Мінскам) — узяла неблагія грошы.

Думаеце адразу ж кінулася траціць іх, нешта сабе купляць? Не!

Па банальных прычынах. Ну па-першае, усё тое, чым завалены цяпер шматлікія крамы і рынкі, падаецца ёй, мякка кажучы, не маючым сэнсу, не вельмі патрэбным... А па-другое — проста бязбожна, беспадстаўна дарагім.

І тых грошай не вартым.

## НА ВЕЧНУЮ ПАМЯЦЬ

Зміцер, як той Дзед Мароз, прыходзіць рэдка і з прысмакамі.

Апошні раз ён пазамінулым летам быў — з булачкамі-піражнымі, з апельсінамі, з вялікай бляшанкай зялёнай гарбаты. Дастаў, гучна паставіў на стол, сказаў:

— Во, успамінаць мяне будзеце...

Хоць мог бы і не казаць, бо спрацоўвала штось міжволі — варта было захацець той гарбаты, варта заварыць... А ўжо п'ючы да кагось частуючы, дык нават расказаць, і якая гэта, і дзе ўзялі...

Зміцер, як той Дзед Мароз, прыходзіў рэдка... Больш — як ні цяжка ў гэта паверыць, ужо не прыйдзе. Зусім.

Ці ўсё ж...

Трэба заварыць гарбаты.

З той самай ягонай бляшаначкі, якую ўжо не выкінуць. Аж да скону.

## ТРАШЧЫ НЕ ТРАШЧЫ...

*Кажуць, мова мая аджывае*
*Век свой ціх: ёй знікнуць пара.*
*Для мяне ж яна вечна жывая,*
*Як раса, як сляза, як зара...*

Гэта — Панчанка з яго пранікнёным:

*Мне не трэба ні славы, ні хлеба,*
*Асудзіце на безліч нягод.*
*Толькі месяцаў назвы пакіньце,*
*Назвы родныя роднай зямлі,*
*Пра якія з маленства ў блакіце*
*Бор шуміць і пяюць жураўлі:*
*Студзень —*
*з казкамі снежных аблокаў,*
*Люты — шчодры на сіні мароз,*
*Сакавік — з сакатаннем і сокам*
*Непаўторных вясновых бяроз,*
*Красавік...*

Зрэшты, да яго, да часу «маланак і ліўняў», яшчэ трэба дажыць, бо на дварэ, і ва ўсю пакуль, уладарыць зіма: і снежыць там, і студзіць, і марозіць — месцамі аж да 30.

Што, аднак, не палохае. Тых, прынамсі, хто трымаецца роднае мовы, хто помніць старую як свет прымаўку: «Трашчы не трашчы, а ўжо па вадохрышчы»!

**Валянціна ДОЎНАР.**




## У Мінску

### Выпіска — праз інтэрнэт. І ніякіх чэргаў

**У Мінску цяпер можна бясплатна замовіць выпіску з амбулаторнай карты па інтэрнэце.**

— Такая паслуга неабходная, каб зменшыць колькасць чэргаў, — расказала начальнік аддзела першаснай медыка-санітарнай дапамогі Камітэта аховы здароўя Мінгарвыканкама Людміла Лугавец.

Выпіскі з амбулаторных картаў патрэбны тым, хто збіраецца ехаць у санаторый, праходзіць вадзіцельскую камісію ці прафілактычны медагляд. Просяць выпіску таксама ў ваенкамаце. Для таго, каб яе атрымаць, выкарыстаўшы новую сістэму, патрэбна зайсці на сайт паліклінікі, спампаваць бланк заявы, запоўніць яго і адправіць на электронны адрас патрэбнай медустановы. Выпіску можна забраць праз 5 дзён, прад'явіўшы пашпарт ці іншы дакумент, што пацвярджае асобу.

## На Брэстчыне

### Аўталаўкі з навігатарам

**Праца аўтакрам на Брэстчыне цяпер будзе кантралявацца з дапамогай GPS-навігатара.**

Машыны не заўжды дабіраюцца ў далёкія вёскі ў вызначаны час. Вырашыць праблему паспрабуюць з дапамогай прылады, якая будзе адсочваць, дзе ў гэты момант знаходзіцца крама на колах, якая, па правілах, мае права спазняцца хіба што на 10-15 хвілін.

— Аўталаўкі абслугоўваюць каля 83 тысяч жыхароў Брэстчыны, таму важна, каб машыны дабіраліся да пакупнікоў своечасова і не прымушалі людзей чакаць, — расказаў намеснік старшыні праўлення Брэсцкага аблспажыўсаюза Васіль Міхалюк.

Кантраляваць аўталаўкі з дапамогай навігатараў, па словах Васіля Міхалюка, у Брэсцкім аблспажывсаюзе пачалі першымі ў Беларусі.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## У Чачэрску

### Абваліўся дах прыватнага дома

**Гаворка ідзе пра жылы дом, размешчаны па вуліцы Пушкіна ў Чачэрску.**

— Было ўстаноўлена, што часткова абвальванне даху на столевае перакрыцце з пашкоджаннем цаглянага франтона адбылося з-за няправільнага мантажу кроквам пры будаўніцтве дома, а таксама з-за павелічэння снегавой нагрузкі на дах, — расказаў рэдакцыі старшы інспектар Цэнтра даследавання ў галіне бяспекі жыццядзейнасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алег Малевіч. На шчасце, пацярпелых няма. Далейшай пагрозы разбурэння дома няма. Гаспадыня ад пераезду да родных адмовілася.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Минский городской центр недвижимости

**Извещение о проведении 14 марта 2012 г. открытого аукциона по продаже обращенного в доход государства имущества**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики продаваемого имущества)** | **Автозаправочная станция общей площадью 32 кв.м (инв. номер 122/С-12667)** |
| **Сведения о земельном участке** | Кадастровый номер 123400000001000621, площадь – 0,1000 га, назначение – строительство и обслуживание автомобильной заправочной станции |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | Брестская область, Ивацевичский район, на автодороге Н-706 Коссово-Нехачево, км 1 |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 227 40 22 |
| **Начальная цена** | 119 750 400 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 11 000 000 белорусских рублей |

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **14 марта 2012 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с **07.02.2012 по 12.03.2012 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: (017) 227 40 22. www.mgcn.by**

**07 марта 2012 года состоится общее собрание акционеров ОАО «Лукомльэнергомонтаж»,**

расположенного по адресу: г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8

**Собрание пройдет по адресу:**
г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, актовый зал.

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2011 году и основных направлениях деятельности Общества на 2012 год.
2. О работе Наблюдательного совета в 2011 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия, (покрытия убытков) за 2011 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2012 г. и первый квартал 2013 г.
7. О принятии решения о приобретении ОАО «ЛЭМ» его акций, отчуждаемых акционерами, в период по 31 декабря 2012 г., определении цены приобретения акций, отнесении к компетенции Наблюдательного совета права определения цены приобретения указанных акций.
8. Об увеличении уставного фонда Общества.
9. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
10. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 24 февраля 2012 г., по месту нахождения Общества (приемная) с 13.00 до 16.00.

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 08.00 до 09.45.

**Время начала проведения собрания 10 часов 00 минут.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 1 марта 2012 г.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы:**

**- акционеру Общества – паспорт;**
**- представителю акционера – паспорт и доверенность.**

УНП 300007839

**ПРАДАЕЦЦА**

А/м «Форд Эскорт», 1994 г.в., хэтчбэк, 1,4 аб'ём, расход 5,5 л, бензін, добры стан, за бел. рублі, танна.
Тэл. МТС 764 42 91.

